КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 16 (239) ◂ 22 красавіка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



## ТАКІМ ЖАНЧЫНАМ ТРЭБА КВЕТКІ ДАРЫЦЬ

Пасля арышту 19 снежня ва ўдзельніцы Плошчы Таццяны Грачанікавай дабраякасная пухліна ператварылася ў злаякасную

Стар. 6

## СТОМЛЕНЫЯ МІХАЛКОВЫМ

На 5 мая ў Расіі прызначана прэм'ера фільма «Стомленыя сонцам–3: Цытадэль» (рэжысёр Мікіта Міхалкоў). На думку шматлікіх палітолагаў, рэакцыя гледачоў можа паўплываць на цяперашні палітычны працэс

Стар. 13

## МУЗЫКА ЗА КРАТАМІ

Стар. 5

## АВАНГАРДНЫМ РОКАМ ПА АГІТПРАПУ

Стар. 15

ISSN 2218-2144

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

## ГЕНЫ ВАСІЛЯ ШАРАНГОВІЧА

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Лёсы»

▸ З НАГОДЫ

# 25 ГОД ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ

Вольга ХВОІН

**«Калі падняцца на тэлевежу ў Вільні, то добра бачны хутар Нарвілішкі па беларускі бок мяжы, дзе рыхтуецца пляцоўка пад АЭС. Калі б адбылася трагедыя, не толькі Вільнюс давялося б эвакуяваць. Шчыра кажучы, уся наша краіна апынулася б у паралюшы», — заявіў без дыпламатычнага лоску дарадца аддзела палітыкі энергетычнай бяспекі МЗС Літвы Віліюс Самуйла падчас канферэнцыі ў Мінску, прысвечанай 25-годдзю чарнобыльскай трагедыі, арганізаванай БАЖ.**




«Здзіўляе тое, што Беларусь, якая больш за ўсіх пацярпела ў выніку чарнобыльскай трагедыі, працягвае пашыраць атамную энергетыку і зноў наступае на тыя ж граблі», — сказаў дарадца. Дыпламат зазначыў, што Літва не супраць амбіцый Беларусі ў галіне атамнай энергетыкі, але астравецкую пляцоўку называе нерацыянальным варыянтам размяшчэння станцыі.

«У міжнароднай практыцы я ніводнага разу не чуў, каб карысць ад якога-небудзь праекта дасталася адной краіне, а ўся рызыка і небяспека выпадалі на долю іншых краін, — сказаў Віліюс Самуйла. — Пасля таго, як японцы не здолелі справіцца са сваім атамным праектам, мне ніхто не дакажа, што беларусы, у якіх па сутнасці практычна няма досведу ў гэтай справе, змогуць кіраваць такім праектам». Прадстаўнік МЗС канстатаваў, што літоўскі бок дагэтуль не можа атрымаць поўную інфармацыю пра небяспечнасць станцыі, акалічнасці яе эксплуатацыі. «Вось мы і прапануем: ажыццяўляйце ваш праект у 30 кіламетрах ад Мінска, тады ўсё будзе добра», — некалькі разоў падкрэсліў Віліюс Самуйла.

Дырэктар Дэпартамента ядзернай бяспекі Дзяржаўнай інспекцыі па бяспецы атамнай энергетыкі Сігітас Шлепавічус гаворыць: «Карысць, якую прынясе АЭС, мусіць пераважыць над рызыкай радыяцыйнага забруджвання, таму мы мяркуем, што суседзі павінны выбіраць іншую пляцоўку. Іншы аспект, калі выбіраюць пляцоўку, трэба прытрымлівацца міжнароднага права». Саюз зялёных Літвы ўвогуле супраць атамнай энергетыкі ў рэгіёне. «Амерыканцы пасля Фукусімы загадалі сваім жыхарам выехаць на адлегласць 80 кіламетраў ад АЭС. Вільнюс у гэтую зону ўваходзіць, Каўнас таксама недалёка. Наша партыя супраць будаўніцтва ўсіх трох АЭС (маюцца на ўвазе літоўская, калінінградская і беларуская — рэд.) на такой невялікай тэрыторыі», — сказаў намеснік старшыні партыі Саўлюс Лапеніс.

Актыўную пазіцыю прыбалтыйскай краіны, выступаючы на міжнароднай канферэнцыі ў Кіеве, агучыў і літоўскі прэм'ер Андрыюс Кубілюс. Ён заклікаў прымяняць эканамічны байкот да краін, якія належным чынам не забяспечваюць бяспеку сваіх АЭС. Ён выступіў з крытыкай беларускага атамнага праекту ў Астраўцы, заявіўшы, што АЭС, якая будуецца недалёка ад літоўскай мяжы, не адпавядае патрабаванням экспертызы ўплыву на навакольнае асяроддзе і стварае пагрозу для, як мінімум, паўмільёна людзей. Ён таксама падкрэсліў, што пасля чарнобыльскай трагедыі Літва пагадзілася, хоць тое шкодзіла яе эканамічным інтарэсам, на закрыццё Ігналінскай АЭС, на якой працавалі рэактары таго ж тыпу, што і чарнобыльскія.

Прадстаўнікі літоўскіх дзяржструктур упэўненыя, што Беларуская АЭС — расійскі праект. І кіраваць ім будзе, адпаведна, Расія. «Мы мяркуем, што ўсім праектам кіруе Пуцін. Лукашэнка з-за эканамічных праблем вымушаны пагаджацца з яго ідэямі. А ідэя такая — калі Беларуская АЭС будзе пабудавана недалёка ад Вільні, значыць, адносіны паміж беларусамі і літоўцамі пагоршацца. Таму Беларусі будзе яшчэ складаней інтэгравацца на Захад», — гаворыць журналіст часопіса «Дзяржава» (Valstyb ) Эдуардас Эйгірдас.

З гэтым згодны і прафесар, ліквідатар аварыі на Чарнобыльскай АЭС Георгій Лепін: «Калі АЭС будзе будуе расійская кампанія «Росатам», то ўсё будзе завязана толькі на Расіі. Хто пабудуе рэактары, той і будзе пастаўляць неабходныя дэталі і паслугі. У нас няма ні аднаго спецыяліста ў гэтай галіне. Расія не выпусціць гэта са сваіх рук, а абслугоўваючага персаналу ў нас няма і ў бліжэйшыя 20 гадоў не будзе. Тыя, каго выпускаюць цяпер інстытуты, толькі праз 20 гадоў будуць спецыялістамі», — сказаў прафесар.

Былы старшыня Вярхоўнага савета Беларусі, фізік-ядзершчык паводле адукацыі Станіслаў Шушкевіч згодны з тым, што выбар пляцоўкі пад будаўніцтва станцыі — найперш палітычнае рашэнне. «Я прыхільнік ядзернай энергетыкі, але я не прыхільнік ваеннай, ядзернай ці нейкі недарэчнай пагрозы суседняй дзяржаве», — падкрэсліў Шушкевіч. Ён зазначыў, што большасць вядомых беларускіх навукоўцаў не былі прыцягнутыя да выбару пляцоўкі пад будаўніцтва атамнай станцыі.

Прадстаўнік Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Барыс Папоў сцвярджае, што станцыя патрэбна і для эканомікі, і для энергетычнай незалежнасці. Ён зазначыў, што цяпер 95% усёй энергіі ў Беларусі атрымліваецца за кошт прыроднага газу, адзіным пастаўшчыком якога з'яўляецца Расія. Дыверсіфікацыя — адзін з найважнейшых фактараў, якія дазваляюць павысіць энергетычную незалежнасць. «У нашых сховішчах прыроднага газу можна назапасіць максімум на 3 месяцы, а можа і менш. У той жа час ядзернае паліва мы зможам захоўваць год і больш», — сказаў Папоў. Аднак традыцыйна пастаўшчыком паліва для станцыі з'яўляецца краіна, якая яе будуе. Атрымліваецца, што расійскія каналы пастаўкі энергапаліва ўсяго толькі пашырыліся.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ



# ВОЛЬГУ КАРАЧ БІЛІ ПА ТВАРЫ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Затрыманую ў Мінску 19 снежня Вольгу Карач пратрымалі ноч у Фрунзенскім РУУС. Яе змясцілі ў клетку, гэтак званы «абезьяннік». Адзін з міліцыянтаў тры разы ўдарыў яе па твары. Другі, па прозвішчы Лінкус, пагражаў ёй згвалтаваннем. А праваабаронцу Паўла Левінава ставілі на расцяжку.**

Пра гэта яны паведамілі, калі наступным днём іх прывезлі ў суд Фрунзенскага раёна. Там 20 красавіка судзілі чатырох актывістаў, затрыманых напярэдадні на кватэры ў праваабаронцы Валерыя Шчукіна.

Міліцыянты абвінавацілі іх у дробным хуліганстве (арт. 17.1 КаАП). Вольгу Карач аштрафавалі на 700 тысяч рублёў. Яе мужу, журналісту Алегу Баршчэўскаму, вынеслі рашэнне аб арышце на 10 сутак. Яшчэ адзін віцебчанін, праваабаронца Беларускага Хельсінкскага камітэта Павел Левінаў, таксама атрымаў 10 сутак. А Павел Станеўскі з Гродна — 8 сутак.

Міліцыянт Аляксей Каваleўскі заявіў у судзе, што Вольга Карач паводзіла сябе буйна і агрэсіўна, лаялася і правакавала бойку з міліцыяй. І яе затрымлівалі 8 міліцыянтаў. Суддзя Таццяна Шумская адмовіла Вользе ў хадайніцтвах аб допыце яе сведак і азнаямленні з матэрыяламі справы. Яшчэ актывістка паведаміла, што з яе сумкі пасля дагляду прапалі 450 тысяч беларускіх рублёў. Рапарт на яе склаў міліцыянт Галавін. Вольга Карач будзе абскарджваць судовае рашэнне.

А Алег Баршчэўскі выкрыў міліцыянтаў у фальсіфікацыі. У пратаколе стаіць не яго подпіс, бо ён гэтую паперу не падпісваў. Арышт журналіст атрымаў за «нецэнзурную лаянку».

На судзе Паўла Станеўскага сведкі з боку міліцыі настолькі заблыталіся, што сведчылі пра тое, што пратакол быў складзены раней, чым адбыўся факт правапарушэння (брыдкаслоўе). Актывіста кампаніі «Наш дом» міліцыянты вінавацілі і ў бойцы.

Суддзя Вольга Комар накіравала справу Паўла Станеўскага на дадатковае расследаванне ў міліцыю. Бо і паказанні міліцыянтаў, і міліцэйскія пратаколы супярэчаць адзін аднаму. Актывіст быў адпушчаны на волю.

Аднак ён быў зноў падманам затрыманы. Міліцыянты прапанавалі пад'ехаць у РУУС, каб аддаць дакументы. Да 23 гадзінаў ні сябры, ні родныя не ведалі, дзе ён знаходзіцца. Раніцай Паўла Станеўскага даставілі ў суд. І суддзя Вольга Комар вынесла рашэнне аб арышце.

Справу праваабаронцу Паўла Левінава таксама разглядала суддзя Вольга Комар. Павел спытаў суддзю: «Ці не тая вы Комар, якая ўнесеная ў спіс неўязных на тэрыторыю Еўрасаюза?» Левінаў распавёў, што ў міліцыі яго павалілі тварам на стол, заламілі рукі, надзелі кайданкі і здзекаваліся. Ставілі на расцяжку і распраналі да трусоў. «У камеры я замярзаў і галадаў. Гэта не катаванні, гэта тэрор адносна грамадзянаў сваёй краіны», — заявіў ён. Пасля вынясення пастановы суда аб арышце Павел Левінаў абвясціў галадоўку.

Усяго ў міліцыю 19 красавіка разам з Валерыем Шчукіным даставілі 18 чалавек. З іх 14 адпусцілі без складання пратаколаў, у некаторых узялі адбіткі пальцаў. Праваабаронца паведаміў, што яны адзначалі дзень народзінаў на кватэры яго дачкі. Міліцыянты прыйшлі для праверкі дакументаў, перапісалі дадзеныя і сышлі. Але потым з'явіліся зноў і абвясцілі, што правядуць вобшук. Паводле іх словаў, гэта звязана з расследаваннем крымінальнай справы па тэракту ў мінскім метро.

Чацвёрка актывістаў была затрымана першапачаткова «па падазрэнні ў датычнасці да тэракту 11 красавіка». Але потым ім выставілі абвінавачанне «ўсяго толькі» ў мацюканні.

АКЦЫЯ

# МАЦІ ПАЛІТВЯЗНЯЎ — ПАД КАНВОЕМ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Акцыя салідарнасці з палітвязнямі ў Мінску адбывалася 19 красавіка пад назіраннем асобаў у штацкім. Ад Чырвонага касцёла ўдзельнікі акцыі са знічкамі ў руках прайшлі ля СІЗА, МУС, КДБ. І паставілі свечкі ля метро, дзе загінулі людзі падчас тэракту.**

У гэты дзень споўнілася чатыры месяцы, як былі арыштаваныя ўдзельнікі акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў. І дзевяць дзён, як адбылася трагедыя на станцыі метро «Кастрычніцкая».

Грамадскія актывісты і маці вязняў запалілі знічкі і памаліліся за вызваленне тых, хто бязвінна знаходзіцца за кратамі. «Іх там катуюць, вельмі ім там цяжка, — сказала адна з удзельніц акцыі Ганна Шапуцька. — Няма ніякіх законаў у нашай краіне. Шмат людзей з'ехала. Ім таксама вельмі складана. Шмат людзей пакутуюць тут, у Беларусі, пасля збіцця. Вы ведаеце, як іх моцна збівалі, як нявечылі».

«Акцыі ля касцёла адбываецца штодзённа, — адзначыла Таццяна Зялко, старшыня ініцыятывы па стварэнні Саюза пенсіянераў «Наша пакаленне». — Сюды прыходзяць, ставяць свечкі і моляцца за тых, хто бязвінна пасаджаны. Гэтыя людзі нічога крымінальная не здзейснілі. Яны сядзяць толькі за тое, што мелі сваё ўласнае меркаванне. І яны хацелі яго выказаць. За гэта іх пасадзілі ў турму. Гэта проста здзек з людзей».

На рагу Міністэрства ўнутраных спраў жанчыны спыніліся і пачалі маліцца. Да іх падбег міліцэйскі начальнік, таксама ў цывільнай вопратцы, і ў грубай форме загадаў сысці ад будынку. А на падыходзе да метро жанчынам перагарадзіў дарогу намеснік начальніка Цэнтральнага РУУС Максім Грышчанка са спецназаўцамі. Ён размаўляў з жанчынамі зняважальна і груба, і прымусіў зняць бел-чырвона-белыя шалікі.

Таццяна Зялко паспрабавала паразмаўляць з раз'юшаным міліцыянтам. На што ў адказ пачула: «Пайшла вон адсюль. А то будзем размаўляць у іншым месцы». Жанчына зрабіла заўвагу, каб прадстаўнік праваахоўных органаў ёй не «тыкаў». І запытала яго прозвішча. «Даведаешся ў іншым месцы», — зноў па-хамску адрэагаваў міліцыянт.

«Па адной», — загадаў Грышчанка прапускаць жанчын да стэндаў з фотаздымкамі загінулых. Там яны ўшанавалі памяць ахвяраў тэракту.

«Вядуць як злачынцаў, — кажа Таццяна Зялко. — Мне цяжка сказаць, што іх раздражняе. Мяне гэта глыбока абурае і здзіўляе. Хочам ціха прыйсці памаліцца і свечкі паставіць. Але, высвятляецца, мы і тут перашкаджаем. Гэта нават не проста хвароба, а гэта ўжо клініка. У нас вельмі вялікая рэпрэсіўная машына. І разам з тым у нас узрываюцца і гінуць людзі ў метро — гэта недапушчальна. Вось парадак навесці — у нас няма каму. Не дапусціць выбуху — у нас няма каму. А сураваджаць людзей, якія прыйшлі памянуць загінулых — заўсёды ёсць каму. Мне хутка 58 гадоў. Сярод нас і маладыя жанчыны, і больш сталыя. Якую небяспеку мы ўяўляем? Гэта ўжо агонія».

Маці палітвязня Аляксандра Квяткевіча ўпершыню ўдзельнічала ў акцыі. Яе сын абвінавачваецца па арт. 293 ч. 2 Крымінальнага кодэкса (удзел у масавых беспарадках). «Не, страху асаблівага не было, — сказала Алена Міхайлаўна. — Канешне, непрыемна, што ідзем, а за намі канвой. І тут міліцыянт стаіць, і тут ідзе, і там ідуць ззаду. Ведаеце, баяцца ўжо няма чаго. Дый надакучала баяцца. Жыць у свабоднай, як нам кажуць, Беларусі і баяцца хадзіць па зямлі. Колькі можна баяцца ўрэшце?»

ПРАТЭСТ

# БУДЗІМІР СПЫНІЎ ГАЛАДОЎКУ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**У панядзелак, 18 красавіка, на 20-ы дзень галадоўкі пратэсту, блогер Дзмітрый Галко (у блогасферы — Будзімір) абвясціў пра спыненне сваёй галадоўкі. Заява блогера была размешчаная на інтэрнэт-старонцы Дзмітрыя Галко ў сацыяльнай сетцы «Жывы Часопіс».**

Цяпер ужо былы галадоўнік патлумачыў прычыны такога рашэння: «Просьбаў спыніць галадоўку стала так шмат, што далей ігнараваць іх проста непрыстойна. Маці Мікіты Ліхавіда прыходзіла для гэтага да мяне дадому, бацькі іншых палітвязняў напісалі калектыўную тэлеграму».

Будзімір зазначыў, што галадоўцы патрабуецца ўвага грамадскасці: «На жаль, ніякіх салідарных дзеянняў у падтрымку маіх патрабаванняў з боку як бы зацікаўленых асобаў я амаль не пабачыў. Я не кажу пра пікеты, мітынгі ці далучэнне да галадоўкі, але ж усхваляваныя і абуральныя калектыўныя лісты, напэўна, можна было б куды трэба напісаць?» Да таго ж, піша блогер, на ягонае рашэнне паўплываў тэракт 11 красавіка ў мінскім метро, які змяніў інфармацыйны фон у СМІ і пакінуў галадоўку амаль незаўважнай.

Спыненне галадоўкі выклікала станоўчую рэакцыю большасці блогераў. Зараз перад Дзмітрыем Галко стаіць задача выйсці з галадоўкі, што не менш небяспечна для здароўя.

Нагадаем, Дзміты Галко абвясціў галадоўку на знак пратэсту супраць жорсткага прысуду (тры з паловаю гады турмы) 20-гадоваму Мікіту Ліхавіду за ўдзел у акцыі 19 снежня. Дзмітры Галко патрабаваў вызваліць бязвінна асуджанага юнака з турмы. Зараз, каб прыцягнуць увагу да праблемы палітвязняў у нашай краіне, Будзімір заклікае блогераў арганізаваць масавы флэшмоб у выглядзе эстафетнай галадоўкі.

ЧОРНЫ СПІС

# ЗНОЎ ДЭПАРТАЦЫЯ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Пры перасячэнні беларускай мяжы 20 красавіка была затрымана і адпраўлена назад ва Украіну Марына Цапок. Яна з'яўляецца памочнікам прадстаўніка Міжнароднай назіральнай місіі, што працуе ў Беларусі. За апошнія паўтары месяцы гэта трэцяя дэпартацыя міжнародных назіральнікаў.**

Марыну знялі з цягніка, які ішоў з Кіева, на беларускай памежнай заставе «Цяруха». Яна, як і яе калегі з місіі расіянін Андрэй Юраў і ўкраінец Максім Кіцюк, трапіла ў «чорны спіс» замежных грамадзян, якім забаронены ўезд у Беларусь. Аб гэтым гаворыцца ў распаўсюджаным паведамленні Міжнароднай назіральнай місіі, што здзяйсняе маніторынг за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Прадстаўнікі Камітэта міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі, якія накіравалі місію для назірання, расцэньваюць гэты факт як непасрэдную перашкоду яе дзейнасці. На думку ўкраінскіх і замежных калег Марыны, падобныя выпадкі выдварэння павінны стаць прадметам для пільнай увагі з боку Міністэрства замежных спраў Украіны. Літаральна праз тыдзень запланаваны афіцыйны візіт Лукашэнкі ў Кіеў.

Ва Украіне і Расіі, пасля папярэдніх выпадкаў дэпартацыі назіральнікаў, стартавала кампанія «За адкрыты ўезд у Беларусь». Яна накіраваная супраць беларускай практыкі «спісаў неўязных». «Пра тое, ці знаходзіцца чалавек у такім спісе, немагчыма даведацца загадзя з адкрытых крыніц. І, такім чынам, абскардзіць. Прычына занясення ў спіс таксама, як правіла, афіцыйна не паведамляецца», — адзначае Міжнародная назіральная місія.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ІНШАЯ БЕЛАРУСЬ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Пасля выбуху ў мінскім метро Беларусь больш не будзе ранейшай. «Крыштальны сасуд» ляснуўся, і больш яго не збярэш. І справа не толькі ў выбуху. Наклалася шмат усяго, пачынаючы з дэфіцыту грэчкі. Грэчкі, якая ніколі ў незалежнай Беларусі не была дэфіцытам.**


Photo.ByMedia.Net

Памятаю, як нават у 1990-я гады ў кавамолцы мы малолі грэчку для таго, каб пячы бліны. Бліны з грэцкай мукі. Бо пшанічнай папросту ў продажы не было. Да чаго ж мы дакаціліся, што нават грэчка стала дэфіцытам?

Але ўвага прыцягнутая ўсё роўна да тэракту. Хіба магло быць інакш?

16 красавіка, падчас суботніка Аляксандр Лукашэнка заявіў, што капелюшы з некаторых асобаў усё ж паляцяць. Да адказнасці будуць прыцягнуты і тыя, хто не змог на належным узроўні прадухіліць тэракт у мінскім метро, заявіў Лукашэнка.

«Малайцы, спрацавалі вельмі аператыўна, але ёсць факты, як гэта стала магчымым. Гэта што — не пытанне? Пытанне. І там ёсць элемент вялікай расхлябанасці. Каго? Найбліжэйшым часам скажам. Яны таксама затрыманыя. Я сказаў дапытваць як злачынцаў. Яны маглі пацікавіцца, як гэта чалавек з сумкай велізарнай 20 кг нясе ўзрыўчатку, і ўсё гэта праходзіць міма міліцыі, міма работнікаў метро і гэтак далей», — цытуе Лукашэнку дзяржінфармагенцтва БелТА.

«Добра, мы расслабіліся — грамадства. Але вы там стаіце для чаго? Гэта пытанне ёсць, і шмат новых пытанняў», — падкрэсліў прэзідэнт.

Паводле яго слоў, «калі б не галаваццяства асобных, мы б іх затрымалі раней па выбуху 3 ліпеня 2008 года». «Там былі ўчыненыя злачынствы і службовымі асобамі», — адзначыў Лукашэнка, мячы на ўвазе тых, хто ў сілу сваіх службовых абавязкаў павінен быў прадухіліць тэракт.

«І я вам абяцаю, што мы літаральна да міліметра ўсё гэта пакажам і раскажам. Але тое, што атрымалася хутка раскрыць злачынства, — гэта факт», — сказаў прэзідэнт.

Канешне, галаваццяства. Як паведамляюць СМІ, галоўны падазраваны служыў у войску з зімы 2009 па лета 2010 года. Як ён здолеў пазбегнуць прымусовай дактыласкапіі, якую абавязкова павінны былі прайсці ўсе ваеннаабавязаныя? Як ён пазбегнуў дактыласкапіі ў войску? Тым больш, што ён жа мужчына, а зараз нават у жанчын, у якіх стаіць штамп «ваеннаабавязаная — медсястра» таксама бяруць адбіткі пальцаў!

Лукашэнка абсалютна ўпэўнены, што менавіта затрыманы ўчыніў тэракт у метро. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што першым быў раскрыты не тэракт у метро, а выбух, учынены 3 ліпеня 2008 года каля стэлы «Мінск — горад-герой». «Калі ў яго ўзялі адбіткі пальцаў, мы ж яшчэ не ведалі — ён, не ён, і зверылі з базай даных, убачылі, што яны супадаюць. І ён адразу сказаў: так, гэта я зрабіў (выбух 3 ліпеня 2008 года), расказаў усё, што ўжо следства ведае, па секундах, па хвілінах. Потым ён на здзіўленне прама сказаў, што і выбухі ў Віцебску, і ў метро — справа яго рук», — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Следства кажа, што галоўнаму падазраванаму не больш за 25 гадоў. Што выбухоўка была вельмі прафесійнай. Ці сапраўды чалавек, якому на момант 2011 года 25 гадоў, а значыць, на момант выбуху ў Віцебску было 19, здолеў самастойна вырабіць унікальную выбухоўку? Ды такога не саджаць «на зону» трэба, а закрыць у сакрэтных лабараторыях Міністэрства абароны! Каб ён вынайшаў для нашага войска звычайную выбухоўку, больш эфектыўную за атамную бомбу.

А тым часам Беларусь спрабуе стабілізаваць эканамічную сітуацыю ў краіне. На тыдні Нацбанк прыняў рашэнне аб зняцці з 19 красавіка абмежаванняў па фарміраванні курсу беларускага рубля пры ажыццяўленні здзелак куплі і продажу замежнай валюты паміж банкамі і суб'ектамі гаспадарання. Акрамя таго, разглядаецца пытанне аб увядзенні дадатковай сесіі на валютна-фондавай біржы, дзе плануецца сфарміраваць рыначны курс рубля на аснове попыту і прапановы. Чакаецца, што потым на ўсіх сегментах рынку будзе ўстаноўлены адзіны абменны курс рубля.

Фінансавы аналітык Сяргей Чалы адзначае, што множнасць валютных курсаў без абмежаванняў у той ці іншай форме на рынку наяўнай валюты не ліквідуе дэфіцыт валюты для насельніцтва: «Так ці інакш трэба штосьці прыдумваць. Напрыклад, не даваць больш за 100 долараў у адны рукі або яшчэ штосьці. А так сітуацыя не зменіцца», — лічыць Чалы.

Эканамічны суд СНД 20 красавіка задаволіў хадайніцтва Беларусі аб адкліканні іскавых патрабаванняў да Расіі аб неправамернасці збірання пошлін на нафтапрадукты. Суд пастанавіў спыніць вытворчасць па гэтай справе.

Хадайніцтва ад імя беларускага боку заявіў на пасяджэнні Эканамічнага суда 20 красавіка міністр юстыцыі Віктар Галаванаў, паведаміла дзяржаўнае агенцтва БелТА.

Як зазначыў міністр, зараз паміж Беларуссю і Расіяй вырашана пытанне аб незбіранні мытных пошлін на нафтапрадукты, што пастаўляюцца ў Беларусь. Расійскі бок праводзіць неабходную працу па ратыфікацыі дакументаў аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП).

«Беларускі бок лічыць неабходным адмовіцца ад патрабаванняў у судзе. Мы мяркуем, што гэта паўплывае на ўмацаванне беларуска-расійскіх адносінаў», — сказаў Віктар Галаванаў.

У Расіі прымаўка: «Нічога асабістага — проста бізнэс». Здаецца, у Беларусі іншая прымаўка: «Нічога асабістага і ніякага бізнэсу — проста палітыка». «Умацаванне беларуска-расійскіх адносінаў», — гэта проста словы, то бок, палітыка. А грошы — гэта грошы.

І, нарэшце, не трэба забывацца пра тое, пра што мы не павінны забывацца. Вызначаныя даты судовых працэсаў над Андрэем Саннікавым і Дзмітрыем Бандарэнкам. Саннікава будуць судзіць 27 красавіка ў судзе Партызанскага раёна Мінска. Экскандыдат з 19 снежня ўтрымліваецца ў СІЗА КДБ. Ён абвінавачваецца па артыкуле 293 Крымінальнага кодэкса Беларусі (масавыя беспарадкі), які прадугледжвае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Сябра яго ініцыятыўнай групы Дзмітрыя Бандарэнку будуць судзіць 26 красавіка ў судзе Першамайскага раёна Мінска.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ІГАР ФАМІН



Героямі гэтага тыдня сталі прадстаўнікі фінансава-эканамічнай сістэмы. Як перадае БелаПАН, у Мінэканомікі не выключаюць, што цэны на сацыяльна значных тавары ў Беларусі будуць расці. Каментуючы пастанову Саўміна № 95, дзе зацверджаны пералік сацыяльна значных тавараў і паслуг, дырэктар дэпартамента цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі Ігар Фамін паведаміў, што будуць зменены спосабы рэгулявання коштаў: пераход з фіксаваных на мінімальныя. Па яго словах, пералік тавараў, кошты на якія рэгулююцца Міністэрствам эканомікі, значна скараціўся і цяпер складае толькі 14 пазіцый. Сярод іх: хлеб, мяса, яйкі, малако, мука, цукар, рыс і іншыя.

Ён нагадаў, што цяпер імпарцёры атрымалі магчымасць свабоднага цэнаўтварэння. «Ці будуць адпушчаныя цэны? Мы будзем імкнуцца прымяняць рынкавыя механізмы, што дазволяць як імпарцёрам, так і беларускім вытворцам забяспечыць бясстратную працу і разам з тым забяспечыць даступнасць тавараў», — адзначыў Фамін. Ён таксама падкрэсліў, што для стрымлівання росту коштаў «ёсць некалькі механізмаў, у тым ліку антыманапольнае заканадаўства і магчымасць гандлёвай інтэрвенцыі».

Фамін патлумачыў, што значны рост коштаў на крупы, у прыватнасці на проса, адбыўся з-за росту кантрактных коштаў і з-за таго, што імпарцёры закладваюць у кошт валютныя рызыкі.

### МІКАЛАЙ ЛУЗГІН



Голасам Нацбанка на гэтым тыдні стаў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Мікалай Лузгін. Ён заявіў аб прынятых мерах у галіне фінансавай палітыкі, якія не называюцца дэвальвацыяй, але не надта далёка адышлі ад гэтага тэрміна. Урад і Нацбанк дамовіліся легалізаваць «ценявы» абменны курс беларускага рубля, які склаўся ва ўмовах дэфіцыту замежнай валюты. Рынкавы курс будзе фармавацца на альтэрнатыўнай гандлёвай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы, піша «Радыё Свабода». Раней на пазабіржавым рынку курс мог адхіляцца ад афіцыйнага толькі на 10%. На наступным тыдні беларуская валютна-фондавая біржа правядзе першыя альтэрнатыўныя таргі для вызначэння рынкавага курсу рубля. Ён можа скласці каля 3800–3900 рублёў за долар, прыкладна такі шэры курс існуе і ў разліках паміж прадпрымальнікамі. На біржы будзе ўведзена другая гандлёвая сесія, дзе абменны курс будзе ўсталёўвацца на рынкавых умовах, зыходзячы з попыту і прапановы юрыдычных асобаў.

Пры гэтым дзейны біржавы механізм вызначэння афіцыйнага курсу захаваецца. Гэта значыць, афіцыйны курс будзе вызначацца на асноўных таргах, зыходзячы з прапановы ў рамках абавязковага продажу часткі валютнай выручкі. Тут Нацбанк захавае механізм абмежавальнага задавальнення попыту для крытычнага імпарту (газ, медыкаменты) і пагашэння валютных крэдытаў.

### АЛЕНА ЛЕЎЧАНКА



Адзін з лідараў жаночай зборнай Беларусі Алена Леўчанка разам з калегамі па кракаўскай «Вісле» стала чэмпіёнкай Польшчы пасля перамогі ў фінальнай серыі. Алена была прызнаная самым карысным гульцом фінальнай серыі польскага першынства.

У фінале польскага першынства сустрэліся дзве беларускі — Леўчанка і яе каманда «Вісла» супрацьстаялі камандзе «Полькоўцэ», за якую выступае капітан жаночай зборнай Наталля Трафімава.

Дарэчы, у мінулым годзе Алена Леўчанка атрымала прызнаная не толькі як выбітная спартсменка, але і як прыгажуня. Паводле вядомага амерыканскага часопісу «Jezebel Magazine», яна ўвайшла ў спіс 36 найбольш прыгожых гараджан Атланты.

Галоўным крытэрам адбору стаў пошук людзей, чыя ўнутраная прыгажосць была б на такім жа высокім узроўні, як і знешняя. «Атланта — прыгожы горад, у якім мноства такіх жа прывабных неардынарных гараджан. Гэта спартсмены, акцёры, мастакі, учынкі якіх поўныя дабрыні, веры і любові», — піша выданне. Беларуска Алена Леўчанка трапіла ў гэты спіс, бо выступае за клуб WNBA Atlanta Dream.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПАД ВЕТРАЗЯМІ ПРОСТЫХ РАШЭННЯЎ

Сяргей НІКАЛЮК

**Ёсць такая выдатная футбольная стратэгія — называецца «бі-бяжы». Яна ўніверсальная. Яе сучасны палітычны аналаг — байкот-дыялог.**






На мінулым тыдні я наведаў мерапрыемства, на якім дыскутавалі суаўтары двух канкуруючых стратэгічных канцэпцый: байкоту і дыялогу. Падчас дыскусіі прагучала сентэнцыя: «У Беларусі сацыялогіі няма». Ну што тут скажаш? Не пашанцавала беларусам, як у свой час не пашанцавала грамадзянам СССР. Памятаеце? «У СССР сэксу няма».

Адкрыем слоўнік. «Сацыялогія — гэта навука аб грамадстве, сістэмах, што складаюць яго, заканамернасцях яго функцыянавання і развіцця». Няма сацыялогіі — няма і ведаў аб грамадстве. Але тады, прабачце, пра якія палітычныя стратэгіі можна весці гаворку?

Мы заўсёды аналізуем факты, абапіраючыся на пэўныя тэорыі, нават калі паняцця не маем пра іх існаванне, папросту замест навуковых тэорый мы выкарыстоўваем побытавыя. Да прыкладу, ці шмат каму з чытачоў «НЧ» вядомыя працы швейцарскага псіхолага Жака Піажэ? Думаю — адзінкам. Ну і што? Мы і без Піажэ выдатна даем рады выхаванню сваіх дзяцей. Праўда, спецыялісты сцвярджаюць, што практычна кожнае дзіця да пэўнага ўзросту — патэнцыйны геній. Калі гэта сапраўды так, то дзе ж беларускія геніі? Яны сталі ахвярай педагагічнага невуцтва сваіх бацькоў.

## Чалавек з сур'ёзнымі прапановамі

Але я залез у нетры. Калі апазіцыйны палітык адмаўляе беларускай сацыялогіі ў праве на існаванне, то ён мае на ўвазе, што ў рэспубліцы адсутнічае *правільная* сацыялогія, г. зн. сацыялогія, якая *правільна* вымярае рэйтынгі. Яго цікавасць да сацыялогіі далей рэйтынгаў не ідзе. Грамадствам ён не цікавіцца. Ён палітык, і ўсе яго памкненні скіраваныя на змену існага палітычнага рэжыму. Ён ведае, што ў Беларусі аўтарытарны палітычны рэжым, а на Захадзе — дэмакратычны. Ён прыхільнік дэмакратыі, якая разам з тым забяспечвае змену ўлады праз механізм выбараў. Як гэта адбываецца на практыцы, ён шмат разоў бачыў па канале «Еўраньюс».

Але ў Беларусі няма не толькі сацыялогіі, здольнай правільна вымяраць рэйтынгі, але няма і выбараў у заходнім сэнсе. Для таго, каб айчынны выбарчы стандарт падняць да ўзроўню заходняга, неабходна, паводле агульнага апазіцыйнага меркавання, змяніць выбарчае заканадаўства. Барацьба за яго змену — важны сегмент апазіцыйнай працы. Пад «ціскам» апазіцыі ўлада ў 2009 годзе разгарнула бурную дзейнасць па дэмакратызацыі заканадаўства. Вынік не прымусіў сябе доўга чакаць: калі ў 2002 годзе за два месяцы да пачатку галасавання ў роўныя ўмовы для ўсіх кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў верылі 24% рэспандэнтаў, то ў 2010 годзе — 45% (па дадзеных НІСЭПД). Як той казаў, за што змагаліся…

Выбары і ўлада ў Беларусі разведзены як у часе, так і ў прасторы. Нічога новага ў гэтым сцвярджэнні няма. Гэта азбукавая думка, аднак засвойваецца яна ў нас з цяжкасцю. Таму спашлюся на імпартны аўтарытэт: «Нашто наогул ва ўмовах аўтарытарызму праводзяцца выбары. Найбольш кампактнае, але пры гэтым дбайна па-эмпірычнаму абгрунтаванае тлумачэнне дае Беатрыса Магалоні (Beatriz Magaloni) у некалькіх артыкулах, дзе яна пераканаўча паказвае, што адзіны фактар, які тлумачыць распаўсюджанне электаральнага аўтарытарызму па працягу апошняга дзесяцігоддзя, — гэта міжнародны кантэкст. Электаральны аўтарытарызм заахвочваецца інвестарамі, ён заахвочваецца ўрадамі вядучых заходніх краін як прыкмета пэўнай лібералізацыі рэжыму. Электаральныя рэжымы разглядаюцца інвестарамі як больш стабільныя, а значыць — больш падыходзячыя для інвестыцый, чым неэлектаральныя» (Рыгор Голасаў, палітолаг).

А зараз вернемся на родную глебу. 6 красавіка старшыня АГП Анатоль Лябедзька быў адпушчаны з СІЗА КДБ пад падпіску пра нявыезд. На наступны дзень ён ужо даў шэраг інтэрв'ю. Пра што? Зразумела, пра будучыя выбары: «Я прыйшоў з тым, каб мы зрабілі сур'ёзную прапанову, якая тычыцца новых правіл вядзення выбарчых кампаній. Калі мы сур'ёзна не зменяем выбарчае заканадаўства і правапрымяняльную практыку, я не бачу сэнсу для ўдзелу ў выбарчых кампаніях».

У сілу зразумелых прычын Анатоль не ўдзельнічаў у «стратэгічнай» дыскусіі, якая разгарнулася. Ён яшчэ не паспеў увайсці ў курс падзей, што некалькі разоў і адзначыў у сваіх інтэрв'ю, але для фармулёўкі стратэгічнай мэты яму гэтага і не патрэбна. Усе высілкі павінны быць накіраваны на выбарчую кампанію: у ёй варта ці прыняць удзел, ці байкатаваць.

## Аддайце, калі самі не можаце

На мерапрыемстве, з якога я пачаў «Азбуку паліталогіі», адзін з выступоўцаў марна згадаў «Аранжавую рэвалюцыю». Для беларускай апазіцыі яна стала тым «вобразам жаданага заўтра», дзеля якога варта жыць і змагацца. Аднак тое, што ў свой час дало багатыя парасткі на ўкраінскім чарназёме, не так проста перанесці на айчынны суглінак. «Аранжавая рэвалюцыя» — класічны прыклад межэлітнай разборкі, калі адзін з бакоў наўпрост звяртаецца за падтрымкай да насельніцтва. У гэты момант свая роля ў палітычным спектаклі з'яўляецца і ў прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі, але не варта пераацэньваць яе значэнне.

Дэманстранты, што прымусілі пэўную ўладную групоўку саступіць, разышліся па дамах. Майдан перамог, і яго перамога скончылася паразай. Сучасная дэмакратыя — гэта дэмакратыя ўдзелу. У сваёй знакамітай сарбонскай лекцыі «Што такое нацыя?» у сакавіку 1882 года Эрнэст Рэнан прапанаваў актуальную і да гэтага часу формулу: «Нацыя — гэта штодзённы плебісцыт». Ёсць яшчэ адно выдатнае вызначэнне нацыі, яно належыць Карлу Дэйчу: «Нацыя — гэта грамадства, якое авалодала дзяржавай». Злучаныя разам два вызначэнні дазваляюць нам спасцігнуць глыбіню праблемы.

Зразумела, што за кошт аднаразовага мерапрыемства, нават калі ў якасці такога выступае «аранжавая рэвалюцыя», з аўтарытарнай сучаснасці ў дэмакратычную будучыню не заехаць. За кароткі тэрмін можна перапісаць канстытуцыю, але «перапісаць» грамадства нельга. Але калі паміж узроўнямі дэмакратычнасці канстытуцыі і грамадства ўтворыцца занадта вялікі зазор, то такая канструкцыя робіцца няўстойлівай. Натуральна, падганяць даводзіцца канстытуцыю пад грамадства, а не наадварот. Пасля рэвалюцыйнай эйфарыі пачатку 90-х працэс усушкі і ўтрускі канстытуцый быў праведзены практычна ва ўсіх постсавецкіх рэспубліках, за выключэннем прыбалтыйскіх.

7 красавіка старшыня АГП паведаміў, што, калі знаходзіўся за кратамі, ён спрабаваў праз следчых пераканаць уладу аддаць «апазіцыі эканамічны блок, калі самі не можаце». Тут нам зноў давядзецца звярнуцца да слоўніка. «Эканоміка — гаспадарчая дзейнасць грамадства, а таксама наогул сукупнасць адносін, якія складваюцца ў сістэме вытворчасці і размеркавання».

Эканоміка — гэта не пра тоны і працэнтныя стаўкі. Эканоміка — гэта пра людзей, дакладней, пра адносіны, у якія людзі ўступаюць паміж сабой падчас грамадскай вытворчасці. Эканамічная, палітычная і сацыяльная сферы ўтвараць адзіны комплекс, у якім усе тры складовыя часткі цесна прыганыя адна да адной. Гістарычна так склалася, што наш адзіны комплекс сцэментаваны матэрыялам, імя якому — улада. Нездарма сацыёлаг Юры Левада параўноўваў савецкае грамадства з гарохам, змешчаным у мяшок дзяржавы. Калі мяшок прыбраць, то наступствы гэтага дзеяння для грамадства прадказаць нескладана. Напачатку 90-х гадоў мы гэта і назіралі.

Перш чым прыступаць да рэформаў «эканамічнага блока», неабходна ясна ўяўляць сабе, як функцыянуе ўвесь «адзіны комплекс». У чарговы раз звярнуся да цытавання: «Маё глыбокае перакананне палягае ў тым, што асноўны пасыл рэфарматарства — тое, што для рэфарматара не мае значэння рэальны стан аб'екта рэфармавання. Яго цікавіць толькі той стан, да якога аб'ект прыйдзе ў выніку рэфармавання». Гэта Сымон Кардонскі, адзін з аўтараў тэорыі «адміністрацыйнага рынка». Спадзяюся, праз прызму гэтай тэорыі ў мяне будзе магчымасць зірнуць на рэальны стан беларускага аб'екта рэфармавання ў адной з найбліжэйшых «Азбук паліталогіі».

Я, сын артылерыста, з дзяцінства ведаю азбукавую ісціну: каб патрапіць у цэль, неабходна ведаць не толькі яе каардынаты, але і свае ўласныя. Без прывязкі да мясцовасці стральба (рух і да т.п.) не можа быць **мэтанакіраванай**. Таму любая стратэгія павінна пачынацца з вызначэння ўласных каардынатаў.

## Непрыемныя нечаканасці

А зараз трохі памарым. Уявіце сабе, што незалежныя сацыёлагі **раптам** зафіксавалі *правільныя* рэйтынгі, улада **раптам** пагадзілася на сумленныя выбары, прайграла і **раптам** прызнала сваю паразу. Самае цікавае, што такая сітуацыя ў прынцыпе магчымая, але складзецца яна не пад ціскам апазіцыі, а пад ціскам працэсаў у самой уладзе.

І вось у Дом ураду ўрачыста заязджае «каманда прафесіяналаў». З чаго яна пачне? Калі вы думаеце, што з рэформаў, то патрапіце пальцам у неба. Яна пачне з канстатацыі двух банальных фактаў: па-першае, дзяржаўная казна пустая; падругое, яе рашэнні дзяржаўныя чыноўнікі на месцах сабатуюць. З гэтым стандартным наборам праблем у свой час сутыкнуўся Гамсахурдыя ў Грузіі і Эльчыбей у Азербайджане. А інакш і быць не можа, аўтарытарная ўлада пры поўных дзяржаўных засеках выбары не прайграе.

Далей адкрыццці на галовы чальцоў «каманды рэфарматараў» пасыплюцца як з рога дастатку. Адно з галоўных адкрыццяў — раскол у грамадстве, ці, на мове культуролагаў, «адсутнасць базавага кансенсусу». У беларускага расколу каштоўнасная прырода, каштоўнасці ж, як вядома, не могуць быць прадметам дыскусіі. Калі камусьці падабаецца поп, а камусьці пападдзя, то і абмяркоўваць тут няма чаго. У такіх умовах парламент з месца ўзгаднення інтарэсаў ператвараецца ў сваю супрацьлегласць, што мы і назіралі на прыкладзе Вярхоўных Саветаў у першыя гады незалежнасці. Паўтарыць досвед краін Усходняй Еўропы ў нас не атрымаецца. На пачатковым этапе рэформаў ад такой глыбіні каштоўнаснага расколу ў грамадстве іх Бог бараніў.

**(працяг будзе)**

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# МУЗЫКА ЗА КРАТАМІ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**«На месцы майго Дзімы мог апынуцца любы з 40 тысяч звычайных людзей, што выйшлі на плошчу 19 снежня», — раз за разам паўтарае Клаўдзія Буланава. Яе сын не ўваходзіць у палітычныя партыі ці апазіцыйныя моладзевыя арганізацыі. Тым не менш, хлопец ужо трэці месяц сядзіць на Валадарцы па абвінавачанні ва ўдзеле ў масавых беспарадках.**



Кожны дзень Клаўдзія Буланава чытае Біблію

## Дзесяць дзён пекла

Першыя дні пасля арышту сына Клаўдзія Буланава забудзе нехутка. «Дзіма пайшоў праводзіць сваю дзяўчыну (прынамсі, мне так сказаў), увечары тэлефануе: «Мама, я ў аўтазаку». Я і слова такога ніколі не чула. Пазней перaтэлефанаваў: «Я на Акрэсціна, у мяне разбітая галава. Шукай мяне праз міліцыю». Я злавіла таксоўку, прыехала пад сцены ізалятара, а там дзясяткі аграмадных машын — тых самы аўтазакаў, — узгадвае жанчына ноч 19 снежня. — Я падышла да людзей, адзін мужчына сказаў мне: «Запомніце слова «Вясна». Гэта пазней я ўжо даведалася, што існуе такі праваабарончы цэнтр «Вясна», а тады я была ў паніцы. Што рабіць? Куды звяртацца? Першыя дзесяць дзён я жыла як у пекле».

Адбыўшы дзесяць сутак адміністрацыйнага арышту, сын вярнуўся дадому. «А праз паўтара тыдні яго выклікалі ў міліцыю на допыт. Дзіма папрасіў даслаць позву, яму сказалі пачакаць дома — маўляў, ніякіх праблем, зараз прывязем. Прыехалі нейкія людзі ў цывільным, нават не паказалі папер, і вывелі з кватэры. Апошні раз Дзіма патэлефанаваў пасля допыту, голас гучаў як быццам бы з-пад зямлі. Сказаў, што яго абвінавачваюць у масавых беспарадках. Следчы і дзяжурны адвакат разам на яго крычалі, у выніку ён падпісаў частковае прызнанне. Паказалі артыкул і сказалі: «Твае дзеянні патрапляюць пад гэтыя фармулёўкі. Падпішы частковае прызнанне — выйдзеш». Не выйшаў…» — выгукае Клаўдзія Буланава.

## «У 18 гадоў сам пайшоў хрысціцца»

Сцены ў кватэры Буланавых упрыгожаныя пейзажамі — падарункамі сяброваk-мастачак спадарыні Клаўдзіі, рэпрадукцыямі «Нараджэння Венеры» Сандра Батычэлі і «Троіцы» Андрэя Рублёва. Клаўдзія Булавана — біёлаг, выкладае ва ўніверсітэце. «Я скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, мая сястра — па класе скрыпкі, а Дзіма захапляецца гітараю», — апавядае Клаўдзія Якаўлеўна, заўважаючы маю цікаўнасць да велічнага чорнага піяніна ў зале.



Прыгожы музыка Дзмітрый Буланаў

— Я ў дзяцінстве спрабавала адвесці Дзіму ў музычную школу, але чамусьці яму не прыйшлося тое даспадобы. У восьмым класе ён сам пачаў займацца музыкай, і вось ужо больш за 10 гадоў Дзіма ёю жыве. Ён заўсёды быў самастойным. Нават хрысціцца пайшоў сам у 18 гадоў: я была «партыйнай дамай», хрысціць дзяцей не было прынята». Зараз на газетным століку ў былой «партыйнай дамы» — іконы, Евангелле, свечкі з Іерусаліма і фотаздымак сына. Кожную раніцу жанчына распачынае чытаннем Біблії і малітвамі за сына і іншых бязвінна зняволеных.

Клаўдзія Якаўлеўна кажа, што яе сын доўгі час не мог абраць паміж медыцынай і музыкай. «Ён у дзяцінстве захапляўся біялогіяй. Асабліва шкадаваў дыназаўраў за тое, што так заўчасна вымерлі. У памяць пра дыназаўраў вывучыў усе іх назвы па-лацінску. Раз прыйшоў да мяне, назваў па-лацінску нейкага дыназаўра і пытаецца: «Мама, а якія ў яго зубы: альвеалярныя ці трубчатыя?» Паставіў мяне ў тупік. Дакарае: «Ты ж кандыдат навук — і не ведаеш, якія ў гэтага дыназаўра зубы?!» Я кажу: «Сыне, у мяне іншая вузкая спецыялізацыя. Адкуль жа мне ведаць, якія ў яго зубы?» Дзіма тады з такім гонарам пахваліўся, што зубы ў дыназаўра трубчатыя, і ўсё мне пра яго расказаў», — смяецца Клаўдзія Буланава.

Хлопец скончыў медвучэльню, хацеў перад паступленнем у медычнскі інстытут на свае вочы паглядзець, як працуюць лекары. Працаваў медбратам у інфекцыйным шпіталі. Адпрацаваўшы тэрмін размеркавання, Дзмітрый вырашыў усё ж прафесійна заняцца музыкай і паступіў у Інстытут сучасных ведаў на кафедру мастацтва эстрады.

Дзіма іграў прагрэсіў-метал (музыка ў стылі «Pink Floyd», «Queen»). Якраз перад арыштам ён сфармаваў новы склад гурта з даволі вопытных музыкаў, ездзіў па Беларусі, выступаў у клубах Мінска, Гомеля. Напісаў праект на стварэнне ўласнай студыі для маладых музыкаў, нават знайшоў спонсара. Хлопец спрабуе пісаць музыку і ў турме, але, будучы басістам, без інструмента гэта рабіць амаль немагчыма.

А яшчэ хлопец пачаў пісаць па-беларуску. «Я перачытвала Караткевіча і на эмоцыях скончыла ліст сказам на беларускай мове. Ён напісаў у адказ слупок па-беларуску. А ў апошні раз — цэлы ліст! Я б і сама яму адказала па-беларуску, але пісала адказ у горадзе, дык не было слоўніка пад рукою», — шкадуе Клаўдзія Буланава.

## Мы абавязкова пераможам

Гаворачы пра сына, Клаўдзія Якаўлеўна дэталёва ўзгадвае ягоны арышт, памятае даты ўсіх лістоў і скаргаў. А скаргаў было нямала — большая частка напісана з нагоды цяжкой хваробы Дзімы, што напаткала яго на Валадарцы, зваліла з ног літаральным сэнсе гэтых словаў.

«Адным ранкам Дзіма проста не змог устаць — не валодаў нагамі. Да гэтага ў яго хварэла горла, цёк нос — мяне гэта моцна напружвала, бо калісьці ў яго была рэўматычная ліхаманка як ускладненне прастуды. Мае дрэнныя прадчуванні спраўдзіліся — у яго апынулася паўторная рэўматычная ліхаманка з захворваннем сэрца — эндакардытам», — патлумачыла Клаўдзія Буланава. З вялікімі цяжкасцямі жанчына дамаглася, каб сына цягам месяца перавялі ў Рэспубліканскую агульнасаматычную лякарню (шпіталь для вязняў), дзе яму распачалі лячэнне. Дзіма на ногі ўстаў, але ж сэрца маці працягвае непакоіцца: «Дзіму нават не падабралі лекі. Замест таго, каб праверыць, якія яму падыходзяць, і мэтанакіравана знішчаць хваробу, яму проста ўсё колюць па чарзе, правяраючы, што эфектыўней…»

Клаўдзія Буланава доўга распавядае пра лячэнне сына, жанчына патрацілa шмат уласнага часу і грошай, каб дапамагчы сыну выжыць. Дзмітрыя лечаць ужо два месяцы, але яго жыццё працягвае знаходзіцца ў небяспецы. Клаўдзія Буланава ўсміхаецца, узгадваючы адзін з лістоў-адпісак наконт лячэння сына. Адпісак было безліч, але гэтая больш за ўсе іншыя ўразіла жанчыну сваёй нахабнасцю: «Я падрабязна апісала стан здароўя сына; напісала, якія я лекі набывала, з якімі лекарамі сустракалася, як лекар па маёй настойлівасці прыязджаў у турму аглядаць сына, змяняў яму дыягназ, і пыталася, якія далейшыя меры з таго боку будуць прынятыя ў працэсе ягонага лячэння. Прыйшоў адказ: проста перапісаны ўвесь мой ліст, і выстаўлялася гэта, як быццам бы яны ўсё гэта рабілі».

«Дзіма на акцыі асабліва не хадзіў, хоць палітыкай цікавіўся. Быў на Плошчы ў 2006 годзе, прыйшоў і зараз, але што будзе далей — нават не ўяўляю», — сумуе па каханым дзяўчына Дзімы Надзея. Цяпер дзве мужныя жанчыны спрабуюць адваяваць у неміласэрнага лёсу свайго Дзіму. «Мы з Дзімам дамовіліся, што будзем моцнымі. Я буду моцнай дзеля яго, а ён — дзеля мяне. Так мы абавязкова пераможам», — упэўнена гаворыць Клаўдзія Буланава, запальваючы выратавальную свечку з Іерусаліма.

ПАКАЗ

# ГУЛЬНЯ Ў ВАЙНУШКУ

Андрэй РАСІНСКІ

**19 красавіка на ўправе БНФ адбыўся паказ тэлевізійнага фільму «Гульня ў вайнушку», прысвечанага беларускай арміі. Фільм зняты на тэлеканале «Белсат» Антосем Цялежнікавым.**

Былы палітычны прызыўнік Франак Вячорка, які прадстаўляў карціну, пажартаваў, што ён бы, на месцы Лукашэнкі, рэжысёра Цялежнікава неадкладна арыштаваў, і выказаў надзею на бурную рэакцыю чыноўнікаў з Міністэрства абароны, якім дасляў стужку.

Фільм, даволі сціплы па мастацкіх якасцях, пабудаваны на гутарках з нядаўнімі прызыўнікамі, якіх у арміі «лекавалі» ад згубных палітычных перакананняў. Галоўны апавядальнік — Франак Вячорка, які дзеля гэтага зноў апрануў форму. Героямі стужкі таксама сталі маладафронтаўцы Іван Шыла, Андрусь Цянюта, фатограф Сяргей Гудзілін.

Колішнія жаўнеры кажуць пра затармажанасць арміі, якая загразла ў савецкіх часах і захавала старую форму, але не мае сучаснай тэхнікі. Кажуць пра беларускую мову ў арміі, дакладней, пра яе адсутнасць.




Гучыць шмат здзекаў з гаспадарча-паказушнай практыкі, якой падмяняецца вайсковая падрыхтоўка. Вядзецца гутарка і пра дзедаўшчыну, якой, паводле міністэрскіх чыноўнікаў, у Беларусі няма.

Але кадры, схопленыя мабільнымі тэлефонамі, сведчаць, што ёсць. Увогуле, многія сцэны знятыя самімі жаўнерамі на свае тэлефоны. А Франак Вячорка, каб распавесці пра рыццё акопаў, папросту залез са здымачнай групай на тэрыторыю сваёй былой часткі праз дзірку ў плоце.

Афіцыйная хроніка, навязліва пададзеная праз здзекліву музыку, мантажуецца з апытанкай на вуліцах, дзе юнакі выказваюць пра вайсковы абавязак зусім неафіцыйныя думкі.

Пасля прагляду фільму адбылася дыскусія. Гледачы, пераважна прызыўнога веку, ухвальна казалі пра стужку. На папрок, што ўсё ў карціне ў чорным святле, Вячорка адказаў, што, каб праблемы вырашыць, трэба іх паказаць.

А праблемы сапраўды ёсць. І не толькі праблемы тэлевізіі, што спрабуе гуляць у вайнушку. Не толькі праблемы разумення, калі людзі з рознымі поглядамі глядзяць адзін на аднаго праз калючы дрот.

Ёсць праблема няствoранай беларускай арміі.

Бо чыя ў Беларусі армія, калі жаўнера абяцаюць расстраляць за беларускую мову?

▶ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ТАКІМ ЖАНЧЫНАМ ТРЭБА КВЕТКІ ДАРЫЦЬ



Вольга ХВОІН

**«Таццяна вас з раніцы чакае — у кватэры прыбралася, сама прыхарашылася», — праінфармаваў мяне муж Таццяны Грачанікавай. Сапраўды, выжыць жанчыну з жанчыны складана — у следчы ізалятар просяць перадаць касметыку, у лякарнях турбуюцца, ці хораша выглядаюць, прычоска, нягледзячы на хваробу.**

Пасля арышту 19 снежня ва ўдзельніцы Плошчы Таццяны Грачанікавай дабраякасная пухліна ператварылася ў злаякасную. Падчас выбарчай кампаніі яна дапамагала аднаму з кандыдатаў у прэзідэнты: збірала подпісы, распаўсюджвала агітацыйныя матэрыялы. У нядзелю 19-га Таццяна пайшла на Плошчу, дзе яе збілі, затрымалі і пакаралі 15 суткамі арышту. Яна звярталася да суддзі з просьбай аб змене формы пакарання, зважаючы на хваробу, а таксама да начальніка турмы па дазвол патэлефанаваць, каб паведаміць родным ці адвакату. На ўсе яе звароты пісьмова адмаўлялі. Пасля вызвалення Таццяна паўторна здавала аналізы, зноў стала ў чаргу на аперацыю. У выніку жанчыне дыягнаставалі рак спачатку II, а цяпер ужо III ступені.

Муж Таццяны, прыхільнік Руху «За Свабоду» Юрась Шпак-Рыжкаў быў сябрам выбарчай камісіі ад апазіцыі ў леташняй выбарчай кампаніі. Пасля затрымання на Плошчы адсядзеў 10 сутак. Нягледзячы на тое, што на яговым утрыманні знаходзіцца цяжкахворая жонка, была даведка, што Юрась прысутнічаў на пасяджэнні ўчастковай камісіі, дырэктар прадпрыемства «Мингорсвет» звольніў работніка па артыкуле «за прагулы».

Юрась з парога паведаміў, што жонка ад яго доўгі час хавала хваробу.

— А вось неяк усе жанчыны хаваюць, калі хварэюць на рак. Я была ў анкалагічным цэнтры, і калі нехта змог абысціся без хіміі, апраменьвання, то ўвогуле не казалі родным. Мая мама дагэтуль не ведае пра маю хваробу. Спадзяюся, у знаёмых хопіць такту не расказаць, бо я моцна перажываю за яе здароўе, — распавядае Таццяна. — Мінулай восенню я хадзіла да доктара, аналізы ўзяць не змаглі, але сказалі назірацца ў анкалагічным аддзяленні. Потым змянілася заведуючая аддзялення, дзе я назіралася, і мяне накіравалі на абследаванне, пасля чаго сказалі, што тэндэнцыя кепская. Мусіла быць падрыхтоўка да аперацыі, урачы званілі мне дадому, але ніхто не падымаў трубку. У гэты час я была на «сутках», зразумела, у не самых лепшых умовах.

— Два месяцы прайшло паміж планаванай і фактычнай аперацыяй. Спачатку дыягнаставалі другую ступень раку, цяпер ужо трэцюю. Магчыма, тым самым хочуць зняць з сябе адказнасць. Летам была здаровая, а цяпер такі цяжкі стан... Учора мусіла легчы ў бальніцу, але месцаў няма. Ды, чаго хаваць, усе, хто там ляжаць, нешта плацяць, — з абурэннем у голасе далучаецца да размовы Юрась Шпак-Рыжкаў.

Таццяна спрабуе прыглушыць яго запал:

— Наконт хабараў хачу сказаць — іх ніхто не вымагае, але ўсе даюць. У дыспансеры цяжкая атмасфера, у палаце ляжаць па шэсць чалавек. Зробяць апраменьванне — і чалавек сам сабе прадстаўлены.

***— Калі б была магчымасць яшчэ раз пражыць тыя моманты, вы б сышлі з Плошчы ці засталіся?***

— Калі разам з намі сядзела на «сутках» маладзенькая дзяўчына, ёй прынеслі перадачу ад незнаёмых людзей. І яна так расчулілася, гаварыла, што ў наступны раз пойдзе на вулічны акцыі з сябрамі. У мяне прыблізна тыя ж эмоцыі — я адчуваю вялікую падтрымку, тэлефануюць знаёмыя і незнаёмыя...

***— Вы маглі б умовы ўтрымання ў ізалятары трактаваць як катаванні? Што было найбольш цяжкім?***

— Катаваннямі я гэта назваць не магу, але ўмовы, канешне, не спрыяльныя. Калі нас заводзілі ў аўтазак праз строй амапаўцаў, адзін з іх схапіўся за мой шалік. Сарваў і яго, і шапку. Пасля нават сіняк невялікі быў на шчацэ...

У ізалятары міліцыянты імкнуліся рабіць усё магчымае, пазней падвезлі коўдры і матрацы, бо спачатку іх не хапала. Я адна з апошніх афармлялася. У выніку трапіла ў «двухмесны нумар». Потым на бетонную падлогу трэцяй падсялілі 20-гадовую дзяўчыну. Але праз колькі дзён людзей пераратусавалі, я ўжо знаходзілася ў камеры з Вольгай Чарных і Святланай Барышчук. Гэтыя дзяўчаты «строілі» міліцыянтаў, дык тыя не ведалі, што рабіць.

Калі нас перавялі на Акрэсціна, некаму стала кепска, хацелі выклікаць «хуткую», але нам сказалі, што нават калі і пакладуць у шпіталь, потым усё адно будзеце адседжваць свае «суткі». Ніхто не хацеў сядзець з п'яніцамі і бамжамі, калі ўсіх, каго забралі на Плошчы, ужо выпусцяць. Хаця і сярод нас былі выпадковыя людзі. Нехта за шампанскім пайшоў, адну дзяўчыну пасадзілі на «суткі», калі суседзі выклікалі на яе ўчастковага за шумныя паводзіны. Гэтая дзяўчына не ведала ніводнага прозвішча кандыдатаў у прэзідэнты, апроч Лукашэнкі. Але праз колькі дзён і кругагляд пашырыла, і нават выказваць сваё меркаванне пачала. Там усе былі прыгожыя, інтэлігентныя (смяецца)...

— Ніл Гілевіч сказаў, што такім жанчынам трэба кветкі дарыць, а яны... — абураецца Юрась. Расказвае, як у Таццяны амапаўцы здзіралі з шыі бел-чырвона-белы шалік, як яны з жонкай адганялі ад дзвярэй Дома ўраду тых, хто хацеў іх ламаць.

— Ён мне сказаў: «Нікуды не пойдзем, будзем ахоўваць Дом ураду», — пацвярджае Таццяна.

— Таццяну не пацягнеш за сабой сілком, у 2006-м, калі нас палохалі, што будуць страляць па людзях, я баяўся ісці. Таццяна сказала, што пойдзе адна, і я пайшоў за ёй на ватных нагах. У 2010-м мы пайшлі галасаваць 19 снежня вечарам, а лісты са спісамі, якія мы бачылі, былі амаль пустыя. Потым рушылі на плошчу Незалежнасці.

Юрась і Таццяна дзіўная пара: ён — як бурлівая плынь, энергічны, эмацыйны, яна, наадварот, — стрыманая, тактоўная. Але разам з тым у іх адносінах ёсць нейкія кранальныя ноткі...

— Мы разам столькі ж, колькі і Лукашэнка пры ўладзе, — смяецца Юрась. — Пазнаёміліся ў Расіі, жылі ў Магілёве, але Таццяна даўно сімпатызуе апазіцыі, я за ёй і пачаў хадзіць на мітынгі, ездзіць у Мінск. Потым яе некалькі разоў звальнялі з працы за нашу актыўнасць. Яна нават узначальвала суполку свабоднага прафсаюзу, тады амаль у кожнай арганізацыі былі такія суполкі. Але ўсё раздушылі. У 2003 годзе мы з'ехалі ў Мінск. Таццяна і я доўга шукалі працу. Не ведаю, ці існуюць нейкія спісы непажаданых работнікаў, але вось у нас столькі год стажу, а працу знайсці не маглі. Калі мяне пасля сутак звальнялі з працы, адзін рабочы ўстаў і сказаў, што не падпіша гэтую паперу, жанчына-супрацоўніца ўстрымалася. Астатнія сядзелі і маўчалі...

— Магчыма, атрымаецца пажыць год-другі спакойна, але аднойчы цябе ўсё закране. Цяпер назіраю скандалы ў мясцовым філіяле банка — патрабуюць ад супрацоўнікаў выдаць ім валютныя зберажэнні, хаця, можа, яшчэ не разумеюць, што вінаватыя ў гэтай няпростай эканамічнай сітуацыі не касіры ў банку, — разважае Таццяна наконт таго, ці варта трымацца актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

— Думаю, нашы людзі мусяць адукоўвацца. Прыходзіць калега з вышэйшай адукацыяй і гаворыць: «Пашанцавала нам на цароў — Мікалай І, і Пётр І». Пра нейкі падзел улады, прафсаюзы людзі ўвогуле ўяўлення не маюць. Мне падаецца, трэба выдаваць газеты ў коміксах, каб патлумачыць народу простыя ісціны. У народзе пануюць тыповы разважанні на тэму таго, што трэба галасаваць за Лукашэнку, бо ён, маўляў, ведае, куды трэба ездзіць і з кім размаўляць. Вось такія ўяўленні. Але я думаю, што ўсё адно нейкая грамадзянская супольнасць існуе. Хай разграмяць партыі, але заўжды будуць людзі, якія цікавяцца гісторыяй краіны, яе лёсам. Гэтага не адняць.

Магчыма, у Мінску гэта не вельмі заўважна, бо тут не ўсе навідавоку. А ў маленькіх гарадках кожны ведае паднаготную свайго суседа. Напрыклад, начальнік мае заробак больш-менш прыстойны, ён дасць магчымасць свайму падначаленаму нешта прыхапіць. Людзі звыкліся жыць у такой сістэме. Але ёсць разуменне таго, што ў суседніх краінах па многіх паказчыках лепш. Раней падобныя параўнанні выклікалі злосць, цяпер людзі ездзяць за мяжу і ведаюць, па чым там грэчка, алей. Магу сказаць, што ў людзей ёсць страх перад апазіцыяй, бо стварылі ўстойлівы негатыўны вобраз. Хаця і ад гэтай улады ўсе стаміліся.

* * *

На развітанне Юрась расказвае, як адпраўляе жонку часам пагуляць на свежым паветры, як перажывае за яе здароўе. З запалам расказвае пра свае ініцыятывы і грамадскую дзейнасць. «Яна ж мой рухавік, мой стымул. Я многім ёй абавязаны», — прызнаецца мужчына. І ў голасе чуецца спадзеў, што нейкая вышэйшая сіла ўсё ж адумаецца і пакіне іх разам.

**P.S.**

Таццяне Грачанікавай патрабуецца неадкладнае лячэнне, а сям'і — фінансавая дапамога.

Рэквізіты для пералічэння сродкаў:

Грачанікава Таццяна Анатольеўна
Беларусбанк
філіял 511
аддзяленне 273
рахунак 000 001
9004-Р Дабрачынны рахунак
бел. рублі

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 25 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.30** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Меладраматычны серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**12.10** «Вандраванне ў закаханасць». Камедыйная меладрама (Расія).
**14.15** Сінематэка.
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.25** Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). 1-я серыя.
**18.25** «Акно ў Еўропу». Інфармацыйная праграма.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Чарнобыльскі шлях». Відэафільм.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне».
**22.00** «З чыстага ліста». Трылер (ЗША).
**00.00** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**00.40** Дзень спорту.
**00.50** Хакей для ўсіх.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**11.50** «Спіс Гімлера».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** Фільм «Іспанскі англійскі».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень». І
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Артыстка». Расія, 2007 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** Фільм «Аднакласнікі». ЗША, 2007 г.

---

**06.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Прыгодніцкі фільм «Легенда выспы Двід» (Расія).
**11.05** Пра мастацтва.
**11.35** Школа рамонту.
**12.35** «Ты - тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
**13.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.10** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.05** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.10** Пазакласная гадзіна.
**16.25** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**16.35** Навіны надвор'я.
**17.05** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Кінааповесць «На вайне як на вайне» (СССР).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.35** Авертайм.
**00.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**01.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Казачкі не плачуць. Людміла Хіцяева». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Смак гранату».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** «Сведкі».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Дзманы».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Мотаспорт. Часопіс. Агляд падзей тыдня.
**09.45** Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Зольдэр. 4-ы раўнд.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт. Фінал.
**11.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 9-ы.
**13.30** Веласпорт. Аднадзёнка. Льеж - Бастон - Льеж.
**14.30** Веласпорт. Тур Турцыі. Этап 2-і.
**16.30, 19.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 10-ы.
**18.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 10-ы.
**00.00** Вось дык так!!!
**00.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.15** Веласпорт. Аднадзёнка. Льеж - Бастон - Льеж.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** «Час гонару», серыял: 26 серыя.
**08.20** «Тутэйшыя», тэлеспектакль, 2007 г., Польшча: ч. 1.
**09.10** «Quo Vadis», тэлесерыял: 1 серыя.
**10.00** Канцэрт царкоўнай музыкі: ч. 1.
**10.30** «Паэма веры», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**10.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**11.10** «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1.
**11.40** Два на два (тэледыскусія).
**12.05** «Фаду», дак.-музычны фільм, 2007 г., Іспанія.
**13.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**13.35** «Тутэйшыя», тэлеспектакль, 2007 г., Польшча: ч. 1.
**14.30** «Quo Vadis», тэлесерыял: 1 серыя.
**15.15** «Быць Джульяй», маст. фільм, 2004 г., ЗША–Вялікабрытанія–Канада–Венгрыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаянчоха», серыял: 21 серыя.
**17.35** «Прывід з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**17.50** «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 2.
**18.15** «Катка», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**20.00** Калыханка для самых маленькіх.
**20.10** «Тутэйшыя», тэлеспектакль, 2007 г., Польшча: ч. 2.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.55** «Быць Джульяй», маст. фільм, 2004 г., ЗША–Вялікабрытанія–Канада–Венгрыя.
**23.35** Аб'ектыў.

## 26 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.35** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). 1-я серыя.
**11.40** «Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне».
**12.10** «Я памятаю…». Меладрама.
**13.45** Відэафільм АТН.
**14.05** Прэм'ера. «Радыёактыўныя ваўкі Чарнобыля». Дак. фільм (Аўстрыя-Германія).
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Серыял «Ганначка» (Расія).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). 2-я серыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Шальке - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**23.50** «Павадыр». Меладрама.
**01.40** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Каралеўская рацы. Трагедыі і таямніцы».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Фільм «Целаахоўнік Тэс».
**00.05** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Артыстка». Расія, 2007г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі». Серыял.
**21.30** «Сапраўдная гісторыя».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**00.00** «Водбліскі». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Кінааповесць «На вайне як на вайне» (СССР).
**11.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**12.10** Авертайм.
**12.40** «Страсці па культуры».
**13.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.25** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.20** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.45** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.50** Пазакласная гадзіна.
**17.05** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Баявік «Рэйнджар з атамнай зоны» («Беларусьфільм»).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.35** «Спорт-кадр».
**00.05** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Самагубства пасля Чарнобыля. Акадэмік Легасаў». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Смак гранату».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Смак гранату».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Сведкі».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Развод па-руску».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Увага: вышук!».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Дзманы».
**23.40** «Сапраўдны італьянец». Дакументальны праект.

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 10-ы.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.
**15.00** Веласпорт. Тур Турцыі. Этап 3-і.
**16.30, 19.30, 21.00, 01.15** Снукер.Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit. Часопіс.
**00.15** WTCC з... Часопіс.
**00.45** Мотаспорт. Часопіс. Агляд падзей тыдня.
**01.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Прывід з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**07.40** «Тутэйшыя», тэлеспектакль, 2007 г., Польшча: ч. 2.
**08.25** «Піпі Доўгаянчоха», серыял: 21 серыя.
**08.50** Еўропа сёння.
**09.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**09.30** Прыватная калекцыя.
**10.00** «Катка», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**11.30** «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 2.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Прывід з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**12.20** «Тутэйшыя», тэлеспектакль, 2007 г., Польшча: ч. 2.
**13.05** «Піпі Доўгаянчоха», серыял: 21 серыя.
**13.30** Еўропа сёння.
**13.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**14.10** Прыватная калекцыя.
**14.45** «Катка», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**16.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.30** «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 2.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэрґі», серыял: 1 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 34 серыя.
**18.25** «Дарога да пекла. Атрута», дак. фільм, 2008 г. Беларусь.
**18.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.20** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.40** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.45** «Чарнобыльскія званы», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**22.35** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 3 серыя.
**23.20** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**23.45** Аб'ектыў.
**00.10** Гарачы каментар.

## 27 КРАСАВІКА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.45** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм АТН «Свята Міёрскіх зорак» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Крызіс Веры». Меладрама (Расія).
**14.05** «Акно ў Еўропу». Інфармацыйная праграма.
**14.25** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «OFF STAGE LIFE».
**15.50** Серыял «Ганначка». Закл. серыя.
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Рэал - Барселона. Прамая трансляцыя.
**23.50** «Віноваты па падазрэнню». Драма.
**01.50** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Маніфест Жылуновіча».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Фільм «Амаль знакаміты».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Сапраўдная гісторыя».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**00.00** «Водбліскі». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Дэтэктыў «Прыступіць да ліквідацыі» (СССР). 1-я серыя.
**11.00** Спорт-кадр.
**11.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.15** Медычныя таямніцы.
**12.50** Медычная таямніцы +.
**13.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.10** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.00** «Ты - тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
**15.35** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.40** Пазакласная гадзіна.
**16.55** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**17.05** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Дэтэктыў «Прыступіць да ліквідацыі» (СССР). 1-я серыя.
**20.25** Калыханка.
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**21.55** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.30** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.10** Рэальны свет.
**23.40** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Украінскі самурай. Прынцып Ступкі». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Смак гранату».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Смак гранату».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Цар-Бомба. Апакаліпсіс па-савецку». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Дэманы».
**22.30** «Капітал. RU».
**23.25** «Прыгоды двух італьянцаў у Расіі».
**00.20** «Вочная стаўка».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit. Часопіс.
**09.45** Веласпорт. Аднадзёнка. Льеж - Бастон - Льеж.
**10.55** Спартовае вандраванне. Часопіс.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.
**15.00** Веласпорт. Тур Турцыі. Этап 4-ы.
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.
**17.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Кароткая праграма. Масква (Расія).
**22.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.
**00.00** Еўраспорт для планеты. Часопіс.
**00.30** Конны спорт.
**01.10** Футбол. Матч тыдня. Часопіс.
**01.15** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 2 серыя.
**08.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 34 серыя.
**09.15** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 1 серыя.
**09.40** Праект «Будучыня».
**10.10** Рэпартэр.
**10.35** «Чарнобыльскія званы», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**11.35** Асабісты капітал.
**11.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 2 серыя.
**12.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 34 серыя.
**13.45** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 1 серыя.
**14.10** Праект «Будучыня».
**14.40** Рэпартэр.
**15.05** «Чарнобыльскія званы», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**16.00** Два на два (тэледыскусія).
**16.30** «Дарога да пекла. Атрута», дак. фільм, 2008 г. Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 2 серыя.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.20** Беларусы ў Польшчы.
**18.35** «Геркулес», дак. фільм, Польшча.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.15** Навігатар.
**20.35** Вагон.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Без рэтушы: «Чарнобыльскі шлях прафесара Бандажэўскага», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.45** Два на два (тэледыскусія).
**22.10** «Дэкалог, два», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**23.05** Аб'ектыў.
**23.25** Гарачы каментар.

## 28 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). 3-я серыя.
**12.10** «Шчаслівага шляху». Меладрама (Расія).
**14.05** Шэф-кухар.
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Вострасюжэтны серыял «Апошняя рэпрадукцыя» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). 4-я серыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**22.50** «Клуб рэдактараў».
**23.45** «Эпоха». Фільм «Парыжская школа. Мастакі з Беларусі». Часткі 1-я і 2-я.
**00.50** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Валянціна Мінская. Святая 20-га стагоддзя».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера АНТ: «Хто там?». Аналітычная праграма.
**22.45** Трылер «Барвовыя рэкі».
**00.40** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**09.50** «Вялікі горад».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**00.00** «Водбліскі». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Дэтэктыў «Прыступіць да ліквідацыі» (СССР). 2-я серыя.
**10.55** Бітва экстрасэнсаў.
**11.55** Дача здароўя.
**12.30** Жансавет.
**13.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.05** Серыял «Сіла прыцягнення» (Украіна - Расія). Заключная серыя.
**15.00** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.30** Пазакласная гадзіна.
**16.45** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Дэтэктыў «Прыступіць да ліквідацыі» (СССР). 2-я серыя.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал. Порту - Вільярэал. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал. Бенфіка - Брага.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** Прэм'ера. «Паляванне на «Асу». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Смак гранату».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Смак гранату».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Баль на ўвесь свет».
**11.15** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Дэманы».
**22.40** Вострасюжэтны фільм «Час грахоў».
**00.20** «Вочная стаўка».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Серыя Рэно. Іспанія.
**10.00** WTCC з...
**10.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/4 фіналу.
**14.15** Тэніс. Часопіс.
**15.00** Веласпорт. Тур Турцыі. Этап 5-ы.
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/2 фіналу.
**18.10** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Адвольная праграма. Масква (Расія).
**20.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Адвольная праграма. Масква (Расія).
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/2 фіналу.
**00.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/2 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Дэкалог, два», маст. фільм, Польшча.
**08.30** «Геркулес», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**08.55** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**09.45** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 2 серыя.
**10.10** На колах.
**10.35** Беларусы ў Польшчы.
**10.50** Сальда (эканамічная праграма).
**11.10** Без рэтушы: «Чарнобыльскі шлях прафесара Бандажэўскага», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**11.30** Два на два (тэледыскусія).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, два», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**13.00** Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча ў тэатры «Буфо»: ч. 2.
**13.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**14.15** «Геркулес», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**14.45** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 2 серыя.
**15.10** На колах.
**15.40** Беларусы ў Польшчы.
**15.55** Сальда (эканамічная праграма).
**16.10** Без рэтушы: «Чарнобыльскі шлях прафесара Бандажэўскага», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**16.30** Два на два (тэледыскусія).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «Тым, хто кахае», маст. фільм, 1998 г., Іспанія–Францыя.
**19.05** Маю права (прававая праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.25** Невядомая Беларусь: «Гуканне вясны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Форум (ток-шоў): «Кошты жыцця на Беларусі».
**22.35** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**23.35** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

## 1 ТРАЎНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.35** Мультфільмы.
**08.05** Нацыянальны адборачны тур «Новая хваля- 2011» і «Дзіцячая Новая хваля -2011». Гала-канцэрт. Абранае. Частка 1-я.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-4» ( Украіна).
**12.10** «Кадрыля». Камедыя (Расія).
**13.50** Сінематэка.
**14.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Ведай нашых: Мікалай Мірны».
**15.50** «Ванька Грозны». Камедыя (Расія).
**17.50** Суперлато.
**18.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**19.45** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.50** «КЕНО».
**20.00** У цэнтры ўвагі.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**23.30** Прэм'ера. «Байкер». Меладрама (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** Легендарнае кіно ў колеры. «Волга-Волга».
**11.55** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.30** Камедыя «Каралева бензакалонкі».
**14.05** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**15.05** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Керч».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.25** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.45** «Вялікая розніца».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Матч пойнт».
**23.25** Прэм'ера. Прыгодніцкі фільм «Агора».

### СТВ

**06.40** Фільм «Джэк Васьмёркін - «амерыканец»». СССР, 1986 г. Заключныя серыі.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Добры дзень і бывай». СССР, 1972 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Паміж анёлам і нячысцікам». Францыя, 1995 г.
**22.40** Канцэрт ансамбля «Сябры».
**00.55** «Тэніс. Кубак М. Паўлава».
**01.55** «Спецпрызн». Серыял.

### ЛАД

**08.00** Дабравест.
**08.25** Мір вашай хаце.
**08.40** Іранічная камедыя «Сардэчна запрашаем, або Староннім уваход забаронены» (СССР).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Медычныя таямніцы +.
**10.55** Школа рамонту.
**12.05** Тэлебарометр.
**12.10** Нашы тэсты.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Бухта капітанаў.
**14.00** Баявік «Замах». 3-я і 4-я серыі.
**16.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Арсенал - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**18.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія - Славенія.
**20.00** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.05** «Навіны надвор'я».
**21.40** Смешная часіна.
**22.10** Камедыйная меладрама «Тэрмінал» (ЗША).
**00.35** Культасвет.
**01.10** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. БГК ім.Мяшкова - Дынама (Мінск).

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Гадкае качаня». 2011 г.
**10.20** Камедыя «Максім Перапяліца».
**12.10** Камедыя «Паласаты рэйс».
**14.00** Весткі.
**14.15** Юбілейны вечар Аляксандры Пахмутавай.
**17.50** Прэм'ера. «Парад зорак». Святочны вечар.
**20.00** Весткі.
**20.25** «Танцы з Зоркамі». Гала-канцэрт.
**00.00** Прэм'ера. «Добры вечар з Максімам».

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.50** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Баль на ўвесь свет».
**11.20** «Дачны адказ».
**12.30** «Сеанс з Кашпіроўскім».
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.15** Вострасюжэтны серыял «Мядзведжы кут».
**19.00** «Сёння».
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Мядзведжы кут».
**00.10** «Футбольная ноч».
**00.40** Парадыйная камедыя «Кінаспатканне».

### EUROSPORT

**09.30** Гоначная серыя Рэно. Гонка 1-я.
**10.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/2 фіналу.
**11.00** Футзала.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. 1/2 фіналу.
**13.45** Гоначная серыя Рэно. Гонка 2-я.
**15.00** Веласпорт. Тур Турцыі. Этап 8-ы.
**16.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**19.00** Футзала. Кубак УЕФА. Фінал.
**20.15** Мотаспорт. Часопіс.
**20.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**00.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Гала-канцэрт. Паказальныя выступы. Масква (Расія).
**01.15** Веласпорт. Тур Турцыі. Этап 8-ы.
**02.15** Мотаспорт. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**08.30** «Машына зменаў», тэлесерыял: 7 серыя.
**08.55** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** «Электравік», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**09.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**10.00** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**10.20** Два на два (тэледыскусія).
**10.50** Форум (ток-шоу): «Кошты жыцця на Беларусі».
**11.35** «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., дак. фільм, Германія: 4 серыя, «Літва».
**12.30** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.55** «Машына зменаў», тэлесерыял: 7 серыя.
**13.25** Калыханка для самых маленькіх.
**13.55** «Адна рука не пляскае», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**15.40** «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): выступ гурта «Neuro Dubel».
**16.05** «Ранча», серыял: 52 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 27 серыя.
**18.10** Дакументальная гадзіна: «Ян Павал II і ягоны сябар», дак. фільм, Польшча.
**19.00** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**19.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.20** «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «Svet Boogie Band».
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Італьянец», маст. фільм, 2005, Расія.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.55** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

**www.novychas.org**

ПАРАЛЕЛІ

# АПЕРАЦЫЯ «ПРЫМУСОВАЯ КААПЕРАЦЫЯ»

Алег НОВІКАЎ

**Калі вас моцна закрануў крызіс, паспрабуйце кампенсаваць свой стан навінамі з сонечнай Кубы, дзе справы яшчэ горшыя. Не дарма пасля перапынку ў 30 гадоў тут скліканы з'езд Камуністычнай партыі Кубы.**




Пачаць трэба з гісторыі. Роўна 50 гадоў таму, раніцай 16 красавіка 1961 года, амерыканская авіяцыя нанесла ўдары па кубінскіх аэрадромах. 17 красавіка на бераг у Заліве свінняў пачалі высаджвацца кубінскія антыкастраўскія эмігранты — салдаты так званай брыгады 2506.

Кубінскае кіраўніцтва здолела хутка разабрацца ў сітуацыі і накіравала ў раён высадкі «гусанас» (так называлі контррэвалюцыянераў) сілы, дастатковыя для іх падаўлення. У выніку баёў контррэвалюцыянеры страцілі 82 (па іншых дадзеных — 115) чалавек забітымі і каля 1187 — палоннымі. Пазней палонныя былі выкуплены амерыканскім прэзідэнтам Кенэдзі за 53 мільёна долараў.

50-гадовы юбілей гэтых гістарычных падзей кубінцы адзначалі па ўсім свеце. З той розніцай, што адны святкавалі, а іншыя сумавалі. У Маямі (цэнтр антыкастраўскай эміграцыі) чальцоў брыгады 2506 называюць не як інакш як «пакутнікамі за свабоду». У іх гонар у Фларыдзе прайшлі рознага кшталту жалобныя мерапрыемствы.

Прыкладна 150 кіламетраў на поўдзень ад Фларыды панавала іншая атмасфера. Па цэнтру Гаваны ў рамках вайсковага параду прамаршыравалі жаўнеры і маракі. Аднак цвіком юбілею, безумоўна, стаў з'езд адзінай зарэгістраванай у краіне Партыі камуністаў Кубы (РСС).

Хаця партыя была заснаваная ў далёкім 1965 годзе, кубінскія камуністы збіраліся на свае з'езды толькі пяць разоў. Самі кастрысты тлумачаць гэта тым, што іх партыя — не «масавая партыя», а «партыя рэвалюцыйнага авангарду», прадстаўнікам якога няма сэнсу збірацца без асаблівай справы.

Чамусьці да такога кшталту прахадных спраў адносіцца і пытанне кіраўніцтва. Пасля таго, як у 2006-м Фідэль Кастра з-за хваробы фактычна пакінуў пасаду партыйнага лідара, гэтыя функцыі выконвае яго брат Рауль. Аднак апошні толькі зараз вырашыў, што прыйшоў час адмовіцца ад прыстаўкі «часова выконваючы абавязкі».

Па вялікім рахунку, тое, што абмяркуюць на з'ездзе, было вядома загадзя. Яшчэ напрыканцы лютага ўсе мясцовыя секцыі РСС атрымалі тэкст на 32 старонкі — матэрыялы будучага кангрэсу. Было праведзена 163 мільёны (такую лічбу агучвае газета «Granma» — орган РСС) сустрэчаў партыйцаў, на якіх абмяркоўваліся праекты дакументаў. Галоўная частка тэксту была прысвечаная праблемам эканомікі. Па словах партыйных бонзаў, з'езд павінен «задаць новыя дэфініцыі кубінскай эканомікі».

Сітуацыя тут сапраўды жахлівая. Фінансавая сістэма Кубы знаходзіцца на мяжы калапсу. Знешні доўг Кубы — больш за 20 мільярдаў. Расці яму ўжо папросту не даюць, бо ўсім відавочна, што Куба — банкрут. Краіна штогод імпартуе тавараў на 14 мільярдаў долараў, а экспартуе — толькі на чатыры. Усе дружна прызнаюць фіяска мадэлі паралельных валют. Яна ператварыла народны песа, якімі выплачваюць заробак звычайным кубінцам, у фанцікі. Сярэдні заробак зараз складае 18 долараў ЗША.

Якое выйсце з сітуацыі бачаць камуністы? Аказваецца, звольніць вялікую частку бюджэтнікаў (1,8 з 4,9 мільёна занятых у гэтым сектары чалавек) і прымусіць іх развіваць прыватны сектар — як правіла, рознага кшталту дробныя паслугі (цырульні, кафэ, сельскія кааператывы). Яшчэ адна «радыкальная рэформа» — машыны 1950-х гадоў выпуску можна будзе перадаваць пад прыватныя таксі.

Як кажуць афіцыйныя эканамісты, гэта не жарты. Тут ёсць вялікі рэзерв. Толькі за апошні год 190 тысяч кубінцаў сталі індывідуальнымі прадпрымальнікамі або запісаліся ў кааператары.

Нейкім чынам гэта ўсё нагадвае нараджэнне кааператыўнага руху ў СССР. З тым улікам, што ў кааператары ў нас не запісвалі амаль гвалтоўна, звальняючы з працы.

Усе гэтыя інавацыі і павінны былі прапанаваць дэлегаты. Аднак у апошні момант у праграму з'езду мерапрыемства давялося ўносіць карэктывы — да Кубы дакацілася рэха паўстанняў у арабскіх краінах. Асабліва ўлады палохае лівійскі сцэнар. Тым больш, на днях былы прэм'ер Іспаніі адкрытым тэкстам заклікаў Захад пасля ліквідацыі Кадафі перакінуць флот NATO да кубінскіх берагоў для знішчэння тыраніі Кастра. Таму лагічным можна лічыць тэзіс Рауля Кастра, які ў прамове на з'ездзе заклікаў да ратацыі партыйнага кіраўніцтва. З гэтага часу 10 гадоў — максімальны тэрмін, які апаратчык РСС можа знаходзіцца на адной і той жа пасадзе.

Апазіцыя крок Рауля не ацаніла. Лідар апазіцыйнай Камісіі па праблемах правоў чалавека і нацыянальнага адзінства ў каментарах для «Radio Marti» (апазіцыйная кубінская радыёстанцыя ў ЗША) звяртае ўвагу на тое, што Рауль Кастра так даўно знаходзіцца пры ўладзе, што пасля падобных слоў у якасці прыкладу меў бы сысці ў адстаўку. У дадзеным выпадку Рауль, як лічыць апазіцыя, папросту легалізуе яшчэ 10 гадоў свайго рэжыму, якія абяцаюць быць для яго вельмі цяжкімі.

Тут, праўда, ёсць адно «але». З'езд павінен абраць другога сакратара. Раней усё было проста. Старэйшы брат — сакратар. Малодшы — намеснік. Цяпер трэба абіраць кагосьці з боку. З улікам саліднага ўзросту братоў (Фідэлю — 85 гадоў, а Раулю — 82) гэты нехта атрымае някепскія шансы стаць хутка першым. Праўда, скептыкі кажуць, што абраны на з'ездзе другі сакратар — патэнцыйны нябожчык. Усе згадваюць, як закончыў жыццё папулярны генерал Арнальда Ачоа, адзін з легендарных удзельнікаў барацьбы супраць дыктатуры Батысты. Яго абвінавацілі ў гандлі наркотыкамі і расстралялі.

Парадаксальна, аднак з'езд крытыкуюць і некаторыя камуністы. У партыі склалася групоўка, якая лічыць прапанаваныя Раулем рэформы абсурдам. «У простых кубінцаў няма інвестыцыйнага капіталу для пачатку свайго бізнесу, нават уяўлення пра рынкавыя адносіны няма», — кажа адзін з іх у інтэрв'ю нямецкаму выданню «Tageszeitung». Дададзім, што кубінская фінансавае права не ведае нават такога тэрміну, як малыя крэдыты (такая банкаўская паслуга толькі-толькі з'явілася, аднак застаецца неразвітай з-за таго, што ў краіне існуе дзве паралельныя валюты).

Праўда, нават камуністы-артадоксы згодныя з тым, што трэба нешта мяняць. Гэта пры тым, што сацыяльная тэматыка з'яўляецца адзінай, якая неяк легітымізавала рэжым у вачах грамадзян.

Застаецца дадаць, што ў згаданых дакументах з'езду РСС гаворыцца, нібы «Куба ў адрозненні ад іншых краін ніколі не будзе вырашаць праблему крызісу шляхам шокавай рынкавай тэрапіі».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларусь апынулася на мяжы. Кошты растуць, нацыянальная валюта, беларускі рубель, абясцэньваецца. Па словах жыхароў Мінску, з прылаўкаў крам ужо пачалі знікаць некаторыя імпартныя прадукты. Хоць маштабы цяперашняга крызісу пакуль не ясныя, прадчуванне бяды распаўсюджваецца, абвастраючыся з-за загадкавага выбуху ў метро. Падобна, гэтая атака пахіснула ўпэўненасць нязменнага кіраўніка Аляксандра Лукашэнкі, які пазіцыянуе сябе як адзінага гаранта бяспекі і стабільнасці. Беларусь цяпер шмат у чым залежыць ад падачак з-за мяжы. Незадаволеныя відавочнай падробкай на прэзідэнцкіх выбарах у снежні і рэпрэсіямі супраць апазіцыі, заходнія ўрады ўвялі санкцыі супраць Лукашэнкі і амаль перапынілі адносіны з ім. І цяпер два галоўных донара Лукашэнкі — Расія і ЕС, — падобна, пакінулі яго. Расійскія лідары, якія за апошнія гады часта ўступалі ў супярэчнасці з Лукашэнкам, паведамілі, што разважаюць пра прадстаўленне Беларусі крэдыту на 3 мільярда долараў. Але эксперты лічаць, што Расія ў абмен можа запатрабаваць няпростых саступак.

**«The New York Times» (ЗША)**

Міжбанкавы курс долара ў Беларусі перавысіў афіцыйны ўжо на 40%. Праўда, эксперты лічаць, што гэта занадта завышаны курс, выкліканы дэфіцытам. Па іх ацэнках, эканамічна апраўданай была б 20-працэнтная дэвальвацыя. Дарэчы, МВФ у сваёй сакавіцкай справаздачы пра стан беларускай эканомікі казаў пра тое, што беларускі рубель пераацэнены на 12–16%. Калі б улады прыслухаліся да меркавання міжнародных экспертаў і своечасова дэвальвавалі нацыянальную грашовую адзінку, то шмат якіх праблем можна было б пазбегнуць.

**«Независимая газета» (Расія)**

Зрэшты, самае нечаканае было сказана пад канец. Беларускі прэзідэнт упершыню павёў гаворку пра іншага прэзідэнта краіны — свайго пераемніка. Першы раз Лукашэнка згадаў «зменшчыка», кажучы пра лідараў апазіцыі: «Буду я ў вас прэзідэнтам ці хтосьці іншы — вы абыходзьце гэтых людзей бокам. Тое, што яны кажуць, — яны б так зрабілі. Запомніце, гэта страшныя людзі». Другі раз, бліжэй да канца гаворкі, Лукашэнка выдаў такую фразу: «Мне, напэўна, і не напэўна, а сапраўды, разам з вамі давядзецца жыць пры новым прэзідэнце». Праўда, нічога пэўнага пра гэтага «новага прэзідэнта» сказана не было. Раней Лукашэнка публічна не дапускаў думкі пра сваю змену.

**Газета.Ру (Расія)**

Без унутраных ворагаў, хутчэй за ўсё, не абыдзецца. Бацьку трэба згуртаваць нацыю, абвінаваціць здраднікаў і адмарозкаў, паказаць, што ён па-ранейшаму нясе Беларусь, як крыштальную вазу, у сваіх надзейных руках. Лепшы спосаб стварыць гэту сітуацыю — абмежаваць людзям доступ да інфармацыі і закруціць гайкі. Гэта значыць, рэакцыя на выбух будзе цалкам прадказальнай: узмацненне сілавога складніку, пошук знешніх і ўнутраных ворагаў і, адпаведна, умацаванне аўтарытарнай — пераходзячай у таталітарную, ізаляваную ад навакольнага свету — мадэль кіравання. Паўтаруся, па вялікім рахунку можна казаць, што ўсё гэта на карысць доўгатэрміновай стратэгіі, якую рэалізуе Лукашэнка. Калі вакол ворагі, ахвочыя разбурыць Беларусь, значыць, адзіны, хто яе выратуе, — вядома ж, Аляксандр Рыгоравіч.

**«Голас республики» (Казахстан)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. З БАНДЭРАЎЦАЎ ЗНЯЛІ АБВІНАВАЧАННІ Ў ТЭРАРЫЗМЕ

Дзевяць сяброў нацыяналістычнай арганізацыі «Трызуб» імя Сцяпана Бандэры зноў на волі. Нагадаем, што ўсе яны былі арыштаваныя пасля таго, як на 1 студзеня ў Запарожжы нехта ўзарваў бюст Сталіну. Нягледзячы на тое, што афіцыйна манумент не меў статуса помніка (яго каля свайго офісу насуперак усім прававым нормам паставілі камуністы) улады паставіліся да выбуху вельмі эмацыйна. У рэгіёне прайшла зачыстка, ахвярамі якой галоўным чынам сталі сябры «Трызубу». Паводле міліцыі, прыператрусах у іх знайшлі зброю. Скандал атрымаў працяг пасля таго, як арыштаваныя праз адвакатаў заявілі, што іх катуюць. Так ці інакш, усё закончылася для арыштаваных добра, хаця абвінавачанне цалкам не знялі. Таксама за кратамі застаўся лідар «Трызубу» Андрэй Стэмпіцкі.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. РАСКОЛ ЭКАЛАГІСТАЎ

Сенсацыйны поспех Зялёных у Германіі, чый прадстаўнік упершыню ў гісторыі стаў прэм'ерам рэгіянальнага ўраду, выклікаў па ўсёй Еўропе вялікую моду на гэты палітычны накірунак. Адначасова абвастрылася барацьба сярод экалагаў за лідарства. Так, у Францыі пра свой намер балатавацца ў прэзідэнты ў 2012 годзе заявіў Нікаля Уло,



Нікаля Уло

вядомы тэлевядучы, пісьменнік. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што Нікаля — сябра партыі «Зялёныя — Еўрапейская экалогія» (EELV). А партыя раней пастанавіла, што прозвішча яе кандыдата будзе названае толькі ўлетку. Плануецца правесці ўнутрыпартыйныя выбары кандыдата, так званыя праймерыс. Аднак Уло вырашыў не чакаць. Ён кажа, што ўжо прайшоў праймерыс, якія яму арганізавала экалогія. Гаворка, відавочна пра яго доўгі стаж барацьбы за прыроду. Сярод сяброў EELV заява Уло выклікала шок. Кіраўніцтва просіць калегу адумацца і прыняць удзел у партыйных праймерыс.

**Па матэрыялах «Liberation» (Францыя)**

### РАСІЯ. ФАШЫСТЫ АБ'ЯДНАЛІСЯ

Не паспелі расійскія ўлады забараніць Рух супраць нелегальнай эміграцыі (ДПНИ), як 18 красавіка нацыяналісты Расіі ў чарговы раз пачалі спробу аб'яднацца: новую палітычную арганізацыю вырашана назваць «Рускі народ». Яе будучыя кіраўнікі не хаваюць, што паспрабуюць зарэгістравацца ў Мінюсце. Поўны спіс арганізацый, якія ўвойдуць у кааліцыю, пакуль не вядомы. Аднак тое, што яна будзе створаная на базе ДПНИ, відавочна. Сваёй галоўнай мэтай стваральнікі новай кааліцыі абвяшчаюць «вяртанне Расіі рускім» і «стварэнне гарантый уплыву рускіх сіл на жыццё і развіццё нацыі і краіны». Палітолагі ў сваю чаргу сумняваюцца не толькі ў тым, што арганізацыя пройдзе рэгістрацыю, але і ў тым, што рускім нацыяналістам наогул удасца аб'яднацца — пры адсутнасці выразнай, кампраміснай праграмы і наяўнасці спрэчак паміж партыйнымі лідарамі. Цікава, што маргіналізацыя праваарадыкальнага руху праходзіць на фоне росту ксенафобскіх настрояў. Сёння лозунг «Расія для рускіх» падтрымліваюць 58% грамадзян краіны, тады як у 1998 годзе ў яго было 43% прыхільнікаў.

**Па матэрыялах «Новый регион» (Расія)**

### ЕГІПЕТ. РАСПУШЧАНА ПРАЎЛАДНАЯ ПАРТЫЯ

Вышэйшы суд краіны прыняў рашэнне пра роспуск Нацыяльна-дэмакратычнай партыі (NDP). NDP была важным інстытутам рэжыму, які панаваў у Егіпце пасля стварэння рэспублікі. Цяпер усе банкаўскія сродкі і нерухомасць пераходзяць пад дзяржаўны кантроль. Раней шэраг апаратчыкаў былі арыштаваныя за тое, што скралі грошы з партыйных фондаў. Ім пагражае турма. Як толькі суд абвясціў пра забарону NDP, частка нацыянал-дэмакратаў заявілі пра выхад з партыі і стварэнне іншай арганізацыі — Новай нацыянальнай партыі. Стваральнікі новай структуры кажуць, што яна не мае нічога агульнага з NDP. Больш таго, сваю ідэйную платформу арганізатары будуюць на аснове прынцыпаў нядаўняй егіпецкай рэвалюцыі. Дарэчы, кіраўніком абнаўленцаў стаў былы пляменнік прэзідэнта Анвара Садата.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

ВЫБАРЫ

# ШАНСЫ ФУХІМОРЫ

**У выніку першага туру прэзідэнцкіх выбараў у Перу Кейка, дачка былога прэзідэнта Альберта Фухіморы, які сядзіць у турме, выйшла ў другі тур. Пра тое, ці ёсць у яе шанец стаць прэзідэнтам, журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з перуанскім журналістам Хуанам Аліясам.**



***— Давайце ўзгадаем, як Альберта Фухіморы трапіў у турму і за што?***

— У 2005 годзе, праз пяць гадоў пасля ўцёкаў з Перу, Фухіморы наведаў Чылі, якая мае дамову з Лімай аб выдачы падазраваных у крымінальных злачынствах. Паколькі ў Перу на Фухіморы была адкрыта справа па шэрагу артыкулаў, Санцьяга быў вымушаны выканаць просьбу перуанцаў і экстрадаваць Фухіморы на радзіму. Тут яго хутка судзілі за масавае парушэнне правоў чалавека і карупцыю. У выніку былы прэзідэнт, якога напрыканцы інакш як дыктатарам не называлі, аказаўся за кратамі. Адпаведна судоваму рашэнню, ён павінен сядзець у турме 25 гадоў.

***— Як ацанілі прысуд у грамадстве?***

— 80 працэнтаў перуанцаў падтрымалі такі вердыкт. 20 працэнтаў палічылі, што прысуд несправядлівы. Магчыма, гэта настальгія па першай кадэнцыі Фухіморы. Першы тэрмін на пасадзе прэзідэнта запомніўся ліквідацыяй лявацкага партызанскага падполля. Прэзідэнт выступіў вельмі рашуча. Пачалося эканамічнае адраджэнне. Аднак у ходзе другога тэрміну ўсё створанае за пяць папярэдніх гадоў было страчана.

***— Як развівалася сітуацыя ў краіне пасля сыходу Фухіморы?***

— На першых пасля ўцёкаў Фухіморы выбарах перамог Алехандра Таледа. Яму пашанцавала. З ім пагадзіўся працаваць Педра Пабла Кучынскі, вядомы эканаміст, былы функцыянер Сусветнага банку. Кучынскі ўзначаліў міністэрства эканомікі і фінансаў. Калі Кучынскі прыйшоў, дзяржаўная казна была амаль пустая. З таго часу ў эканоміцы назіраецца прагрэс. Галоўным чынам развіваецца экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі. У нас пачалася здабыча газу. Тэмпам развіцця не перашкодзіў нават глабальны эканамічны крызіс.

***— Які сярэдні заробак у Перу?***

— Прыкладна 800 солей. Гэта роўна 300 доларам. Аднак, натуральна, у сталіцы заробкі значна вышэйшыя. Тут стартавая лічба ад 400 долараў.

***— Чаму людзі не падтрымліваюць цяперашняга прэзідэнта Алана Гарсія? Ён нават на выбары не пайшоў.***

— Гарсія здолеў паспяхова працягнуць эканамічны курс папярэдніка. Аднак ён выпусціў з-пад увагі праблему злачыннасці. Калі ўзгадаў, было позна: на носе былі выбары. Між тым, у краіне шмат рабаванняў, забойстваў, вандалізму. Галасуючы ў першым туры 17 красавіка, народ зрабіў яснае пасланне ўладам — нам патрэба стабільнасць і бяспека.

***— Менавіта на гэтых лозунгах рабіла кампанію Кейка Фухіморы?***

— І так, і не. Тэма бяспекі сапраўды займала важнае месца ў яе агітацыі. Кейка, безумоўна, гуляла на асацыяцыях з бацькам, які за 2 гады здолеў разграміць адну з самых буйных тэрарыстычных арганізацый у свеце. Аднак значна больш пунктаў ёй дало наўпроставае атаясамлення сябе з бацькам. 20 працэнтаў Кейка, якія далі ёй пропуск у другі тур, — гэта хутчэй працэнт падтрымкі яе бацькі. Такі рэйтынг Фухіморы стабільна захоўвае апошнія гады. Гэта не адзіны падарунак для любай дачкі. Бацька выконвае функцыю галоўнага дарадчыка Кейка і, хутчэй за ўсё, дапамагае знайсці спонсараў для яе выбарчай кампаніі. Фухіморы як прэзідэнта няма, аднак прэзідэнцкі клан застаўся.

> Кейка Фухіморы — старэйшая дачка Альберта. Ёй 35 гадоў. Калі Фухіморы скасаваў шлюб, дачка, якая засталася з бацькам, пачала выконваць функцыі першай лэдзі

***— Ці можна намаляваць партрэт Кейка Фухіморы?***

— Кейка Фухіморы — старэйшая дачка Альберта. Ёй 35 гадоў. Яна вучылася ў ЗША, замужам. У час свайго прэзідэнцтва Фухіморы скасаваў шлюб. Дачка, якая засталася з бацькам, была вымушана выконваць функцыі першай лэдзі. Іншымі словамі, яна рана зразумела, што такое публічнае жыццё. Ужо пасля таго, як бацьку пасадзілі, Кейка стала дэпутатам парламенту. Аднак большасць аглядальнікаў прызнае, што харызмы ў Кейка няма.

***— Якія палітычная пагляды ў Кейка?***

— Яе партыя «Моц–2011» адносіць сябе да правага ліберальнага лагеру. Яе правыя погляды значаць геапалітычнае падпарадкаванне знешняму курсу ЗША. Гэта звязанае з тым, што яе муж — амерыканец. Апярэджваючы пытанне, адзначу, што ніякага ўплыву на выбары грамадзянства яе мужа не аказвае. Комплекс «праклятых грынга» не характэрны для перуанцаў. Аднак перуанцы не любяць, калі іншаземцы навязваюць ім, як жыць і што рабіць.

***— Што ўяўляе з сябе яе галоўны праціўнік Альянта Умала?***

— Альянта Умала — былы вайсковец, які стартаваў на мясцовым палітычным полі ў 2006 годзе са сваім праектам «Партыя — нацыяналісты». Нацыяналісты — партыя левага нацыяналістычнага накірунку.

***— Ці ёсць у перуанскім грамадстве забабоны супраць удзелу жанчын у палітыцы?***

— Ніякіх забабонаў няма. Напрыклад, мэр Лімы — жанчына. Шмат жанчын з'яўляюцца парламентарыямі. Свае сімпатыі па гендэрнай прыкмеце ніхто ў нас не выказвае. Тым больш, што жанчыны на пасадзе прэзідэнтаў і прэм'ераў — зараз вельмі папулярная фішка ў Лацінскай Амерыцы. Аргенціна, Бразілія, Чылі. Чаму Перу не можа стаць наступнай?

***— Якія прагнозы на другі тур?***

— Шанцы ў Кейка ёсць. Адпаведна апытанням, 49 працэнтаў выбаршчыкаў яшчэ не прынялі канчатковага рашэння. Акрамя таго, Умала — вельмі левы. Ён прыхільнік Чавеса, рэжым якога зараз у крызісе. Хаця і Кейка шмат хто лічыць занадта небяспечным праектам. Вядомы пісьменнік Марыа Варгас Льёса кажа: «Выбар паміж Умалай і Кейка — гэта выбар паміж СНІДам і ракам у тэрмінальнай стадыі».

***— Калі Кейка Фухіморы пераможа, яна вызваліць свайго бацьку?***

— Гэта цяпер самае папулярнае пытанне ў Перу. Кейка доўга не давала адказу на яго. Аднак на днях яна сказала, што паважаючы незалежнасць судовай галіны, яна ў выпадку перамогі не падпіша для бацькі амністыю. Хаця не выключана, што канчатковае рашэнне наконт амністыі будзе прымаць Альберта Фухіморы.

КІНО

# СТОМЛЕНЫЯ МІХАЛКОВЫМ

Алег НОВІКАЎ

**На 5 мая ў Расіі прызначана прэм'ера фільма «Стомленыя сонцам–3: Цытадэль» (рэжысёр Мікіта Міхалкоў). На думку шматлікіх палітолагаў, рэакцыя гледачоў можа паўплываць на цяперашні палітычны працэс.**




Выхад фільма «Стомленыя сонцам 3: Цытадэль» на экран быў запланаваны на 4 лістапада 2010 года, але затым перанесены.

Паколькі «Цытадэль» з'яўляецца працягам фільма «Стомленыя сонцам» (1994) і «Стомленыя сонцам–2: Прадстаянне», ад яго чакаюць шмат чаго. «Прадстаянне», хаця і не акупіў сябе, аднак стаў вельмі гучнай падзеяй. Здаецца, ніводны фільм у гісторыі сучаснага расійскага кіно не быў аб'ектам такой масавай крытыкі.

Яшчэ да прэм'еры ў рунэце з'явілася мноства «фотажаб» на афішу фільма, у якіх высмейваліся пафас і культ асобы Міхалкова. Галоўным чынам, блогеры гулялі са словамі «вялікі фільм пра вялікую вайну», змешчанымі на афішы. «Вялікі фільм на вялікія грошы», — смяяўся шмат хто, згадваючы пра тое, што стужка аказалася вельмі дарагім кінапраектам. Для здымак тэлесерыяла на базе гэтага фільма студыя Міхалкова сабрала амаль 40 мільёнаў долараў. Галоўным чынам гэта былі бюджэтныя сродкі.

Пасля з'яўлення карціны ў рэпертуары кінатэатраў у лагеры праціўнікаў Міхалкова яшчэ пабольшала. Прадукт крытыкавалі ўсе — ад ветэранаў да тынейджараў, ад ліberalаў да камуністаў.

Вось фрагменты некаторых рэцэнзій:

«У фільме наогул мала жывога, сапраўднага, нягледзячы на багацце натуралістычных сцэн смерці, гвалту і жорсткасці. Няма сапраўдных чалавечых пакут — а ёсць часам майстэрская, а часцей грубая імітацыя, якая балансуе на мяжы кепскага густу. Адсутнасць выразнай сюжэтнай лініі кампенсуецца яркімі спецэфектамі, невыносным натуралізмам, якія мяжуюць са смакаваннем, і агульнай эмацыйнай істэрычнасцю».

«Ніякага дачынення да Дня Перамогі і да ветэранаў карціна не мае. З аднаго боку, нам паказваюць чырвонага камандзіра-камуніста, а з іншага — яго ж як лютага праваслаўнага. Рацыянальны розум адмецены спрэс, замест яго мы бачым містычныя бачанні, жыватворчыя абразы, «вось, што крыж жыватворчы робіць».

«Натуралізм, даведзены да гратэску. Шматлікія адарваныя ногі, знявечаныя целы, рэкі крыві, відаць, мелі на мэце зрабіць дадзены фільм сапраўды «вялікім фільмам пра вялікую вайну», як пазіцыянаваў яго самога рэжысёр. Але ў выніку нічога, акрамя агіды, не выклікалі».

Негатыўнаму стаўленню спрыялі навіны з правінцыі. Там мелі месца выпадкі арганізацыі прымусовых паказаў фільма школьнікам за іх грошы. Гэтым пытаннем нават зацікавілася пракуратура. Варта адзначыць, што фільмы з дэманстрацыяй сцэн жорсткасці, якіх у «Прадстанні» багата, забароненыя для прагляду дзецям да 16 гадоў.

Застаецца дадаць, што ніякіх асаблівых узнагарод, у тым ліку міжнародных, стужка не атрымала. На Захадзе яе ўвогуле не зразумелі, хаця Міхалкову ўдалося паказаць карціну ў Канах.

Агульная адмоўная грамадская рэакцыя на шэдэўр Міхалкова стварыла апошняму імідж самага ненавіснага чалавека ў краіне. Прэса нават жартавала наконт таго, што менавіта нянавісць да Мікіты згуртавала расіян.

З іншага боку, былі і пазітыўныя каментары. Напрыклад: «Галоўнае, за што можна сказаць дзякуй Міхалкову, — гэта за нясмелую спробу распавесці пра вайну ў новым ключы. Вядома, ён баіцца распавесці ўсю праўду. Вядома, ён сам гуляе тэрмінатара. Але ў цэлым праглядаецца спроба казаць пра вайну сумленна: ніякі індывідуальны ўчынак не можа лічыцца такім гераічным, каб усе здзівіліся. Усё, што мы сёння ведаем і думаем пра вайну, усе патрыятычныя стэрэатыпы, будуюцца на тэме гераічнасці кожнага, каму сёння за 80. А насамрэч гэта былі простыя людзі, якія апынуліся ў розных крытычных сітуацыях. У фільме ўсе сцэны якраз і ілюструюць малую гераічнасць герояў».

Што тычыцца Міхалкова, то ён пазіцыю крытыкаў ігнараваў па вельмі простай прычыне. «Калі пачынаюць карціну, як той казаў, «мачыць» за 8 месяцаў да яе выхаду, адразу тут відавочна замова. Гэта абсалютная кампанія, прадуманая».

Пра тое, хто замовіў «Прадстаянне», Міхалкоў распавёў узімку ў рамках свайго відэаблогу. Па словах Мікіты, ягоныя поспехі раздражняюць ліберальную фракцыю ў Крамлі, у прыватнасці блізкага да Мядзведзева Марата Гельмана.

«Цытадэль» працягне сюжэтную лінію «Прадстаяння». Мяркуючы па кадрах фільма, хутка мы пабачым наступнае: Сталін асабіста прапануе Котаву выканаць невыканальную місію па захопе ўмацаванага аб'екта суперніка. Той пагаджаецца.

Аднак чым бліжэй да прэм'еры, тым больш спекуляцый наконт палітычных наступстваў дэманстрацыі карціны. Усім вядома вялікае сяброўства Міхалкова з Пуціным і яго публічнае пакланенне расійскаму лідару. Сын аўтара бессмяротных вершаў пра дзядзю Сцёпу нават зняў дакументальны фільм да дня нараджэння Пуціна, а таксама падпісаў петыцыю з заклікам да Пуціна застацца на трэці прэзідэнцкі тэрмін (дарэчы, у парушэнне расійскай Канстытуцыі).

Сваю любоў да Пуціна Міхалкоў выказваў не толькі ў жанры дакументальнага кіно. Амерыканскае выданне «The National Interest» адзначае: «Вялікая Айчынная вайна, якая сапраўды была гераічнай падзеяй, дала шматлікія прыклады самаадданасці і гераізму, прычым у краіне, спустошанай зверствамі камуністаў, калектывізацыяй і сталінскімі чысткамі. Яна аб'яднала насельніцтва і прымусіла ўладу, хай часткова і часова, але рэабілітаваць Праваслаўную царкву як сродак для згуртавання расійскага народа ў барацьбе з ворагам. Аднак цяпер гэта вайна нярэдка выкарыстоўваецца ў расійскім кіно і тэлебачанні ў палітычных мэтах». Выданне лічыць, што падтэкст такіх фільмаў — «ніхто, акрамя Пуціна, не зможа павесці за сабой Расію ў гэтыя цяжкія часы сусветнага хаосу».

У гэтым плане Пуцін дзіўным чынам становіцца заложнікам кінаэксперыментаў свайго фаната Міхалкова. Як вядома з гісторыі, барацьба за ўладу ў Расіі часта пераносіцца і ў іншыя сферы, такія, як літаратура, кіно і тэлебачанне. Таму дэбаты вакол «Цытадэлі» могуць лёгка набыць палітычнае адценне, тым больш, што ў Расіі на днях дэ-факта стартавала парламенцкая кампанія. Акрамя таго, нядаўняя спрэчка Пуціна і Мядзведзева з-за Лівіі агаліла глыбокі раскол сярод палітычнага кіраўніцтва Расіі і ліберальная групоўка ў Крамлі можа паспрабаваць выкарыстаць чаканы правал шэдэўра Міхалкова як рубеж для атакі на лагер пуцінскіх кансерватараў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ДЗМІТРЫЙ ШАШКІН

35-гадовы міністр адукацыі і навукі Грузіі, этнічны рускі, нечакана для ўсіх стаў галоўным кандыдатам на пасаду пераемніка Саакашвілі. Прэзідэнт Грузіі заявіў, што менавіта Дзмітрый можа ўзначаліць Грузію пасля яго сыходу. Сам Шашкін, чыя сям'я трапіла ў Грузію пасля вайны, пачынаў як міністр выканання пакаранняў. Пры ім у Грузіі зняволеным, якія не здзейснілі цяжкіх злачынстваў і ўзорна сябе паводзілі, давалі адпачынак. Пасля кароткай пабыўкі ўсе яны, дарэчы, вяртаюцца ў камеры. У выніку шматлікія сем'і былі захаваны, і атмасфера ў месцах пазбаўлення волі палепшылася. Затым Шашкіна перавялі ў Мінадукацыі, дзе ён правёў маланкавую кампанію супраць хабараў пры паступленні ў ВНУ. У выніку толькі 2% грузінаў заяўляюць, што сутыкаліся з праявамі хабарніцтва ў вышэйшай школе. Новая задума ад Дзмітрыя — з 1 верасня 2011 года ўсе малодшыя школьнікі павінны атрымаюць па нэтбуку. Дык ці будзе Шашкін наступным грузінскім прэзідэнтам? Шматлікія эксперты лічаць, што гэта цалкам рэальна.

### ДЗІЛМА ВАНА РУСЭФ



Прэзідэнт Бразіліі ўзначальвае краіну не больш за месяц. Аднак ужо ўмудрылася трапіць у вялікі скандал. Даўно было вядома, што напрыканцы 1960-х гадоў маладая Дзілма ўступіла ў лявацкую партызанскую групу пад назвай Каманда нацыянальнага вызвалення. Каманда змагалася супраць тагачаснай вайсковай дыктатуры. Праўда, непасрэдна ў тэрарыстычных актах дзяўчына не ўдзельнічала. У 1970-м яе арыштавалі і пасля катаванняў далі тры гады турмы. Адсюль зуб, які Дзілма даўно точыць на тых, хто прыслугоўваў дыктатуры. У гэтым плане не было нічога дзіўнага ў тым, што пасля прыходу ва ўладу Русэф патрабавала адкрыцця архіваў спецслужбаў часоў дыктатуры. Так і зрабілі. Аднак нечакана ў тых архівах быў знойдзены дакумент, які часткова падрывае рэнаме Дзілмы. Калі верыць знойдзенаму дакументу, Каманда нацыянальнага вызвалення на пачатку 1970-х гадоў планавала забойства шэрагу сілавікоў. Больш таго, менавіта Дзілма павінна была адплаціць сатрапам крывёй за пакуты рабочага люду. Цяпер апазіцыя намагаецца выставіць Русэф як закончаную тэрарыстку. Сама Дзілма кажа, што асноўнай мэтай яе дзейнасці ў шэрагах тэрарыстаў была барацьба за правы чалавека.

### ЛЕХ ВАЛЕНСА

Заснавальнік прафсаюзнага руху «Салідарнасць», былы прэзідэнт Польшчы хоча падзяліцца з новымі арабскімі дэмакратыі сваім вопытам дэмакратычных трансфармацый. На днях Валенса адправіўся ў Туніс, каб арганізаваць дыялог паміж апазіцыяй і былымі апаратчыкамі рэжыму Бен Алі. «Польшча мае ўнікальны вопыт дэмакратычнай трансфармацыі. Ён запатрабаваны ў постррэвалюцыйным Тунісе», — кажа адзін з дыпламатаў ААН, якая дапамагае Валенсе ў яго глабальнай місіі. Яшчэ адзін фактар выбару Валенсы ў якасці інструктара — Польшча не мае ніякіх стратэгічных задач у Паўночнай Афрыцы ў адрозненні ад іншых краін ЕС. У рамках свайго візіту Валенса плануе сустрэцца з прадстаўнікамі акадэмічнага свету, апазіцыяй, і моладзевымі лідарамі. Дарэчы, у Тунісе дапамагаць Валенсе будзе іншы польскі экс-прэзідэнт Аляксандр Квасьнеўскі. Ён таксама накіруецца ў краіну па каналах міжнародных структур. Праўда, у яго не такія амбіцыйныя задачы, як у Валенсы. Квасьнеўскі хоча папросту дапамагчы новым туніскім уладам эканамічнымі кансультацыямі.



ПОСТАЦЬ

# СПАДЧЫНА МІХАСЯ РАМАНЮКА

Лявон ЦЕЛЕШ

**Неяк вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Арлоў сказаў: тое, што зрабіў за сваё кароткае жыццё Міхась Раманюк — мастак, мастацтвазнаўца і этнограф, — гэта подзвіг.**

Уладзімір Арлоў добра ведаў Міхася Раманюка, сябраваў з ім, і ён мае рацыю. З сынам Міхася Раманюка, выдаўцам, мастаком, майстрам-фатографам, прадаўжальнікам справы свайго бацькі я сустрэўся ў колішняй бацькавай майстэрні на вуліцы Максіма Танка. Гэта невялікае памяшканне, застаўленае шматлікімі збанкамі, іконамі, саламянымі вырабамі, а сцены завешаныя карцінамі беларускіх мастакоў, якія сябравалі з Міхасём Раманюком. Дзяніс Раманюк расказаў мне пра жыццёвы і творчы шлях свайго бацькі.

А крыху раней у мяне адбылася сустрэча са старэйшым братам Міхася, Леанідам Фёдаравічам Раманюком і з дачкой Леаніда, настаўніцай сярэдняй школы №2 Дзяржынска Наталляй Кардаш. Магчыма, тое, пра што паведалі мне блізкія людзі Міхася Раманюка, будзе цікавым і для чытачоў «Новага часу».



М. Раманюк у майстэрні



М. Раманюк у Жыткавіцкім раёне



На старых могілках

Нарадзіўся Міхась Фёдаравіч Раманюк 3 студзеня 1944 года ў вёсцы Кавалі, што на Брагіншчыне. Бацька яго, Фёдар Раманюк, загінуў на фронце ў Айчынную вайну. Засталася маці, Алена Харытонаўна, адна з чатырма малымі дзяцьмі на руках: Яўгенам, Леанідам, Людмілай і Міхасём. Матэрыяльнае становішча сям'і было вельмі цяжкім, і таму маці вырашыла пераехаць з дзецьмі ў вёску Старынкі, што на Дзяржыншчыне, да сваякоў.

У вёсцы Старынка з яе маляўнічымі краявідамі і добрымі чулымі людзьмі прайшлі дзяцінства і юнацкія гады Міхася. Леанід Раманюк успамінае, што малодшы яго брат Міхась з дзяцінства быў вельмі дапытлівым, любіў маляваць, добра вучыўся ў школе, дапамагаў маці па гаспадарцы. Ад сваіх бацькоў ён унаследаваў мяккі, добразычлівы характар, ветлівасць, павагу да старэйшых. Гэтыя цудоўныя рысы характару засталіся ў яго на ўсё жыццё. Пасля школы Міхась скончыў Мінскі тэхналагічны тэхнікум, адслужыў у арміі, скончыў таксама Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Беларуская Акадэмія мастацтва) па спецыяльнасці мастак-мадэльер. Маючы схільнасць да навукі, Міхась Раманюк скончыў аспірантуру, чытаў студэнтам лекцыі па гісторыі касцюма. З 1989 года і да самай сваёй смерці ён працаваў у Акадэміі мастацтваў загадчыкам кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў.

Міхась быў таксама заснавальнікам і галоўным рэдактарам часопіса «Мастацтва Беларусі», з'яўляўся сябрам Саюза мастакоў СССР. За час працы ў Акадэміі мастацтва Раманюк паспяваў усюды: ён стварыў сцэнічныя строі для Дзяржаўнага народнага хору, для Дзяржаўнага ансамбля танцу Беларусі, выступаў кансультантам многіх мастацкіх фільмаў кіностудыі «Беларусьфільм», дапамагаў у стварэнні экспазіцый Заслаўскага музея народных промыслаў і рамёстваў. Знаходзіў ён час і для напісання кніг, якія ствараліся па матэрыялах яго шматлікіх этнаграфічных экспедыцый па Беларусі. Гэта такія кнігі, як «Песні і строі Піншчыны», «Народны касцюм Чачэрска і ваколіц», буклеты-плакаты «Беларускае адзенне» і іншыя.

У Мінску, а затым ва Францыі, у Парыжы і Ліёне, і ў іншых краінах Еўропы Міхасём Раманюком былі арганізаваны выставы, дзякуючы якім многія еўрапейцы ўпершыню адкрылі для сябе Беларусь. А колькі артыкулаў Міхася Раманюка пабачыла свет у такіх выданнях, як «Беларуская Савецкая энцыклапедыя», «Энцыклапедыя Літаратуры і Мастацтва Беларусі», «Этнаграфія Беларусі», у часопісах «Мастацтва», «Беларусь»!

Дастаю са сваёй кніжнай паліцы энцыклапедыю «Этнаграфія Беларусі», гартаю яе: амаль пад усімі артыкуламі аб беларускіх строях стаіць прозвішча Міхася Раманюка. І за кожным з гэтых артыкулаў перада мной паўстае Міхась Раманюк з яго нязменным капелюшом на галаве, з фотаапаратам у руках, які вандруе па абсягах Беларускага Палесся, азёрнай Віцебшчыны, Магілёўшчыны...

Вялікая частка жыцця Міхася Раманюка прайшла ў экспедыцыях, куды ён браў з сабой з сына Дзяніса. Дзяніс расказаў, што яны дабіраліся з бацькам да намечанага пункта экспедыцыі спачатку цягнікам ці рэйсавым аўтобусам, а потым да той ці іншай вёскі калі на папутках, а калі і пешшу. Бацька яго меў надзвычайны талент размаўляць з вяскоўцамі, яго абаянне, усмешка дапамагалі знаходзіць кантакт з людзьмі. Міхась Раманюк добра ведаў нюансы мовы таго ці іншага рэгіёна Беларусі.

Бацька з сынам ішлі па хатах, ім паказвалі ўсялякія старадаўнія рэчы, усё цікавае фатаграфавалася. Калі ішла размова пра адзенне, то адразу знаходзілася бабулька, якая даставала з куфра народны строй і апранала яго. Нешта каштоўнае куплялася, ці ім папросту дарылі гэтыя рэчы. Такім чынам Дзяніс з бацькам аб'ездзілі і абышлі многія раёны Беларусі, надаючы асобую ўвагу Палессю (Брагінскі, Хойніцкі, Жыткавіцкі, Нараўлянскі і іншыя раёны), дзе зберагліся народныя традыцыі, строі і прадметы хатняга ўжытку — збаны, абразы, фартухі, дываны, кашулі, куфры. Усе гэтыя набытыя рэчы і фотаздымкі ляглі ў аснову выстаў і напісаных Міхасём Раманюком кніг.

Ён першым у Беларусі правёў раянаванне нашай краіны па рэгіянальных асаблівасцях традыцыйнага нацыянальнага адзення беларусаў. Міхась ездзіў у экспедыцыі і ў першыя дні пасля Чарнобыльскай катастрофы, наведваючы забруджаныя мясцовасці. Ён, як і многія жыхары Беларусі, не ведалі тады, што наведванне гэтых зон небяспечна для здароў'я. Дзяніс Раманюк успамінае, што ў многіх мясцовасцях, якія яны наведвалі, не было ніякіх дарог, стаяла жахлівая спякота, з-пад колаў валіў вялізны дым з пылам... І ён з бацькам дыхалі гэтым радыяцыйным паветрам.

Міхась Раманюк літаральна «гарэў», як кажуць, на працы, і вось гэтае «гарэнне», а таксама наведванне небяспечных радыяцыйных рэгіёнаў паспрыялі яго цяжкай хваробе. У 1997 годзе, на 53-м годзе жыцця, яго не стала, памёр ён ад ракавай хваробы і пахаваны побач з маці на могілках у вёсцы Старынкі.

Асобая старонка ў дзейнасці Міхася Раманюка — збор матэрыялаў па беларускіх крыжах і пахавальных абрадах беларусаў. Гэтай працы ён прысвяціў амаль 25 гадоў. Такіх поўных звестак пра беларускія крыжы, надмагіллі і пахавальныя абрады не было раней у навуковай літаратуры ні на Беларусі, ні, наогул, ва ўсім былым Савецкім Саюзе. Усё ж гэта — неад'емная частка народнай культуры і звычаяў.

Унікальная фундаментальная праца Міхася Раманюка «Беларускія народныя крыжы» была выдадзена Дзянісам Раманюком пасля смерці бацькі. Змяшчае яна 303 фотаздымкі і 83 графічныя малюнкі. За сваю творчую шматгранную працу Міхась Раманюк быў узнагароджаны шматлікімі дыпломамі, ён быў лаўрэатам Прэміі 1996 года ў галіне мастацтва. Многія даследчыкі, навукоўцы адзначаюць, што па шырыні і маштабнасці даследаванняў у галіне этнаграфіі Міхась Раманюк і сёння не мае сабе роўных.

Справу бацькі паспяхова працягвае вядомы ўжо на Беларусі і за яе межамі яго сын Дзяніс Раманюк. Разам з беларускім фотамайстрам, супрацоўнікам «Звязды» Анатолем Кляшчуком і беларускім вучоным-арнітолагам, эколагам, кінарэжысёрам Ігарам Бышнёвым ён неаднаразова наведваў з рызыкай для здароў'я забруджаныя радыцыяй землі Беларусі, у тым ліку і тыя, якія апынуліся за калючым дротам. Дзякуючы творчай працы і намаганню гэтых выдатных даследчыкаў быў сабраны вялізны фотаматэрыял, які ўвайшоў у мастацка-публіцыстычны альбом «Чарнобыль».

Альбом выдаў Дзяніс Раманюк, ён жа і аўтар канцэпцыі, укладальнік і мастак гэтага ўнікальнага выдання. У яго ўвайшлі і шматлікія фотаздымкі Міхася Раманюка. Фотаальбом «Чарнобыль» на 256 старонках змяшчае 259 каляровых высокамастацкіх фотаздымкаў, размешчаных у раздзелах «Прырода», «Народ», «Гісторыя», «Чалавек». У гэтым цудоўным выданні можна знайсці звесткі і аб тым, як хавалі ад насельніцтва Беларусі праўду аб небяспецы катастрофы вышэйшыя партыйныя і ўрадавыя чыноўнікі. Задача фотаальбома, з якой яго аўтары справіліся цудоўна, не толькі пазнаёміць чытача з Чарнобыльскай драмай, але і ўвекавечыць чалавечую катастрофу на фоне народнай культуры мінулага і ўнікальнай прыроды. Дарэчы, фотаальбом «Чарнобыль» атрымаў Гран-пры на конкурсе Мастацкая кніга краін СНД.

Праца, пачатая Міхасём Раманюком, паспяхова працягваецца. Дзяніс Раманюк рыхтуе да выдання «Беларускія маляваныя куфры», «Беларускія маляваныя дываны» і іншыя бацькавы творы. Але на ўсё патрэбны і час, і сродкі, чаго не заўсёды хапае. Міхась Раманюк па шырыні і маштабнасці не меў сабе роўных, выконваючы тое, што мог бы ўзяць на сябе вялікі калектыў, ці нават навукова-даследчы інстытут. Быў ён і выдатным сем'янінам, любіў свайго сына і верную спадарожніцу жыцця Наталлю Міхайлаўну, якая таксама была творчай асобай і ва ўсіх справах дапамагала свайму мужу. На жаль, у снежні мінулага года яе не стала.

Штогод, на Радаўніцу, усе родныя Міхася Раманюка наведваюць у вёсцы Старынка магілу свайго выдатнага сваяка. Гэта быў цудоўны чалавек, палымяны патрыёт нашай Бацькаўшчыны. Вечная яму памяць!

МУЗЫКА І КІНО

# ГУРТ ZARTIPO: АВАНГАРДНЫМ РОКАМ ПА АГІТПРАПУ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**На мінулым тыдні культурны цэнтр фальварка «Добрыя мыслі» зноў стаў арэнай авангардных музычных эксперыментаў.**

Гэтым разам усіх тых, хто завітаў у фальварак, чакаў незвычайны канцэрт — выступленне вядомага беларускага авангарднага гітарыста Андрэя Іванова, які сёння ў адной асобе прадстаўляе легендарны віртуальна-інструментальны гурт «ZARTIPO». У праграме канцэрта была дэманстрацыя мастацкай стужкі «Кастрычнік» Сяргея Эйзенштэйна (1927), якая суправаджалася эксперыментальнай музыкай Андрэя Іванова.

Трэба адразу паставіць усе кропкі над «і»: Андрэй не лічыць сябе тапёрам на новы лад, яму проста цікава з дапамогай рок-музыкі выявіць новыя эмацыянальныя адценні ў старых чорна-белых кінастужках, такіх, напрыклад, як эйзенштэйнаўскі «Кастрычнік».

Сюжэт фільма «Кастрычнік» быццам створаны да такіх эксперыментаў: кантрастныя вобразы герояў карціны і яе сюжэтная лінія, а таксама тое, што «Кастрычнік» адносіцца да так званага «нямога» кіно, даюць шмат прасторы для фантазіі выканаўцы і эксперыментаў у постмадэрнісцкім накірунку. У той жа час, Андрэй падкрэслівае, што гэты канцэрт — не адраджэнне тапёрскай традыцыі ў кіно, а сапраўдны рок-канцэрт, драматургія якога абапіраецца на змест класікі савецкага кінаагітпрапу. Нягледзячы на значную частку гістарычных недакладнасцяў і прапагандысцкіх прыёмаў, звязаных з адлюстраваннем гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыяй, стужка Сяргея Эйзенштэйна поўная сімвалічных кадраў і сюррэалістычных сцэн, якія так і просяцца, каб іх «ажывілі» сучасныя музычныя сродкамі.

У музыцы, якая гучала падчас дэманстрацыі «Кастрычніка», былі прадстаўлены ўрыўкі з дзвюх праграм гурта «ZARTIPO», аб'яднаных альбомамі «Overpsycho live» і «Overpsycho ultra», з той толькі розніцай, што на канцэрце ў «Добрых мыслях» былі выкарыстаны імправізацыйныя моманты, якія звязаны з імкненнем больш дакладна адлюстраваць змест мастацкіх сімвалаў стужкі Эйзенштэйна.

Трэба адзначыць, што канцэрт з дэманстрацыяй фільма «Кастрычнік» С. Эйзенштэйна ў творчай біяграфіі А. Іванова і гурта «ZARTIPO» не першы: паспяховая прэм'ера канцэрта на вялікім экране адбылася ў 2009 годзе ў кінатэатры «Перамога», дзе яна ўпершыню дэманстравалася. Працяг быў зроблены ў наступным годзе на Берлінскім на фестывалі TACHELES. Гэтым жа часам рок-канцэрт паводле «Кастрычніка» быў адыграны на фэсце «несвоечасовага мастацтва» «Дах-Жах» у Мінску. І вось Андрэй Іваноў зноў прапанаваў свае музычныя навацыі на суд сталічных слухачоў, цяпер ужо для малога плазменнага экрана «TOSHIBA»...



Андрэй Іваноў і «Кастрычнік»

Вельмі ўразіла тое, што складаная рокавая кампазіцыя Андрэя Іванова была выканана ім аднаасобна, хоць у ёй гучалі партыі бубнаў, сінтэзатараў, секвенсараў. Але гэта не значыць, што «ZARTIPO» — гэта гурт, які выконвае музыку пад фанаграму. Проста ідэю віртуальнага калектыву можна рэалізаваць толькі так: спачатку Андрэем запісваюцца партыі ўдарных інструментаў, накладваюцца электронныя клавішныя. І толькі потым, у час канцэрта, гэтыя музычныя кавалкі дапаўняюцца гітарнымі імправізацыямі.

У выніку музычная кампазіцыя паводле фільма «Кастрычнік» была напоўнена незвычайнымі рытмамі і гукавымі фарбамі, якія былі характэрны для авангардных накірункаў сучаснага музычнага мастацтва. Уражвала разнастайнасць выканаўчай палітры, якую выкарыстоўваў Андрэй для стварэння музычных вобразаў карціны.

Так, напрыклад, каб паказаць хаатычнасць дзеянняў, а з імі маральную дэградацыю Часовага ўрада і яго кіраўніка А. Керанскага, падкрэсліць сарказм аўтарскіх адносін да гэтых антыгерояў рэвалюцыі, былі выкарыстаны сюррэалістычныя музычныя фарбы з арсеналу электроннай музыкі. Сцэны петраградскай гарадской рэчаіснасці (пустыя кварталы і металічныя канструкцыі разводных мастоў, якім у стужцы адводзілася шмат сімвалічнага месца) суправаджаліся тэмбрамі індустрыяльнага (industrial) рока. Своеасаблівы культурны шок чакаў гледачоў менавіта ў тым месцы прагляду, калі аўтары «Кастрычніка» сродкамі новага кіно распавядалі пра «братанне» салдат і матросаў рэвалюцыйнага Петраграда і ваякамі знакамітай у той час «дзікай дывізіі». Радасныя скокі прадстаўнікоў рэвалюцыйнага інтэрнацыяналу былі агучаны такім жа суправаджэннем у стылістыцы хардкорпанка: рытмічна нястрыманым, нават у нечым «бязбашанным». Такі настрой перадаваўся і гледачам, якія потым адзначылі гэты эпізод як адзін з самых запамінальных...

Калі фільм быў скончаны, гледачы некалькі хвілін стоячы віталі Андрэя Іванова і яго шматгадовую музычную дзейнасць, як музыканта-авангардыста. Пачаўшы сваю выканаўчую кар'еру ў гурце «Блізняты», запачаткаваўшы ў Беларусі такі складаны музычны напрамак, як арт-рок, Андрэй і цяпер застаецца верным свайму музычнаму крэда, з годнасцю прэзентуе на міжнароднай музычнай арэне авангардны рок Беларусі.

ЦІКАВА

# ЗАМЕЖНЫЯ ФІЛЬМЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

Зміцер СУЛІМЕНКА

**У беларускіх кінатэатрах паказваюць замежныя фільмы з рускім дубляжом. І таму мне, беларускамоўнаму чалавеку, заўжды няўтульна пачуваецца пры праглядзе. На шчасце, ёсць людзі, якія займаюцца перакладам фільмаў на беларускую мову.**

Спробы перакладаў фільмаў на беларускую мову былі ў 2002–2003 гадах, калі прыватная фірма «Сотвар» выпусціла шэраг мастацкіх і мультыплікацыйных фільмаў.

А ў снежні 2005 года перакладам замежных фільмаў на родную мову пачала займацца творчая ініцыятыва «Беларускі Гальфстрым». Першым фільмам праекту стала брытанска-амерыканская калядная камедыя «Любоў насамрэч» (Love actually). У агучванні стужкі ўзялі ўдзел як прафесійныя акторы: Анатоль Шурпін, Юры Баранаў, Вераніка Пашкевіч, гэтак і палітык Аляксей Янукевіч. Адзін з заснавальнікаў ініцыятывы, Франак Вячорка, зазначыў, што «Беларускі Гальфстрым» паўстаў ва ўмовах, калі дзяржаўны кінапракат фінансуе пераклады замежных фільмаў толькі на рускую мову, і таму новы праект цалкам грамадскі.

Другім фільмам праекту стаў «Нож у сэрца», пераклад якога быў прафінансаваны шведскім пасольствам. Гэта фільм шведскага рэжысёра: серыял у чатырох эпізодах аб эмігрантах з розных краін, якія жывуць у Швецыі.

Летам 2006 года з'явіўся фільм «Шрэк–2», які быў перакладзены Вольгай Калацкай і Зміцерам Саўкам. У агучцы прымалі ўдзел Аляксандр Памідораў, Руся (гурт «Індыга»), Юрый Жыгамонт. Гэта быў не проста пераклад, бо стваральнікі ўнеслі ў яго свае так званыя «фішкі». Напрыклад, калі Шрэк прачынаецца ў доме бацькоў Фіёны пасля папойкі, на пытанне: «Я вас не патурбаваў?» ён спужана адказвае: «Не-не, я проста чытаў гісторыю Беларусі!» Працаўнікі фабрыкі скардзіліся Шрэку не на прафсаюзы, а на кантрактную сістэму. Такіх жартаў было шмат, і яны арганічна ўпісваліся ў мультфільм.

Праз год выйшаў дубляваны фільм «Крымінальнае чытво». У агучцы прымалі ўдзел Аляксандр Памідораў, Лявон і Ганна Вольскія, Піт Паўлаў, Аляксей Янукевіч. Пераклад зрабіў Макс Шчур, а рэдактарамі выступілі Юрась Бушлякоў, Вінцук Вячорка і Пятро Садоўскі. Многім было цікава, як перакладуць лаянкі (у карціне рэкордную колькасць разоў — 271! — ужываецца слова «fuck»). Франак Вячорка адразу сказаў, што беларуская мова — не ёсць толькі вясковая ці толькі інтэлектуальная. Яна — маладзевая, і «мы хацелі даць беларускія словы і бамжу, і гопніку».

Пасля нядоўгага перапынку «Беларускі Гальфстрым» вырашыў узяцца за сур'ёзны фільм. Ім стаў «В значыць Вендэта» — экранізацыя знакамітай антыўтопіі, графічнага рамана Алана Мура. Дзеянне фільма адбываецца прыблізна ў 2038 годзе, калі Брытаніяй, паводле сцэнару, кіруе таталітарны рэжым. Ідэя фільма выяўляецца ў гісторыі дзяўчыны, што пазбаўляецца страху. Адзін са слоганаў карціны гучыць вечна актуальна: «Людзі не павінны баяцца сваіх урадаў, урады павінны баяцца сваіх людзей». Менавіта такі адкрыты палітычны змест карціны і стаў падставай, — падкрэслівае Франак Вячорка, — для дублявання яе на беларускую мову.

Гэта быў апошні фільм, які быў перакладзены творчай ініцыятывай «Беларускі Гальфстрым». З-за таго, што іх дзейнасць не была ліцэнзаваная, арганізатары вымушаны былі спыніцца. Фільм распаўсюджваліся праз сродкі інтэрнэту і сяброў.




Але, нягледзячы на знікненне «Беларускага Гальфстрыма», пачынаюць з'яўляцца новыя ініцыятывы, якія спрабуюць займацца перакладамі. Група энтузіястаў з лінгвістычнага ўніверсітэта і сёння спрабуе перакладаць замежныя фільмы на беларускую мову. А на пачатку 2010 года, з ініцыятывы студэнта гістфака Віталя Быля пераклалі фільм «Форэст Гамп» на беларускую мову. Пытанні з тэхнічным бокам дапамагаў вырашаць Андрэй Кім.

«Мы хацелі зрабіць канкрэтны прадукт, і даволі хутка. У нас працавалі каманды, мы дзялілі фільм на тытры і старонкі і даручалі кожнаму перакладаць сваю частку, быў вызначаны тэрмін.




Прыезд вандроўніцы Джасцін з Амерыкі дапамог удасканаліць наш пераклад», — кажа адна з арганізатараў перакладаў фільмаў Анастасія Кухарэнка. Па яе словах, студэнты лінгвістычнага спрабуюць супрацоўнічаць з ТБМ, дзе ідзе працэс стварэння Рады перакладчыкаў фільмаў. Сёння ідзе праца над перакладам нямога кіно. Гэта фільмы пра Чапліна, і ўжо перакладзена 10 штук. Зараз яны агучваюцца.

Наступным фільмам, які будзе перакладзены, стане французскі фільм «Анёл А». «Хочацца перакладаць такое кіно, якое не надакучыла. Арт-хаўс, гэта, канешне, добра, але нам хочацца перакладаць фільмы для масавага гледача», — зазначае Анастасія Кухарэнка.

*Калі вы валодаеце адной з замежных моў і жадаеце далучыцца да перакладчыкаў, то тэлефануйце: +375298425789 (Наста).*

ЮБІЛЕЙ

# 90 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ МІКОЛЫ ЕРМАЛОВІЧА

Лявон ЦЕЛЕШ

**Мікола Іванавіч Ермаловіч, беларускі гісторык, літаратар, аўтар навуковай канцэпцыі ўтварэння Беларускай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) нарадзіўся 90 гадоў таму, у вёсцы Малыя Навасёлкі, што на Койданаўшчыне. Нядаўна на яго малой радзіме, у памяшканні сярэдняй школы вёскі Вялікія Навасёлкі, адбылася прэзентацыя кнігі «Мікола Ермаловіч» з залатой серыі «Беларускі кнігазбор».**

У актавай зале школы адбылася цікавая размова пра жыццёвы і творчы шлях Міколы Ермаловіча, гучалі напісаныя ім вершы. Гісторык Анатоль Валахановіч расказаў прысутным пра сваё знаёмства з Міколам Ермаловічам, якія цяжкасці давялося пераадолець, каб выдаць першую кнігу М. Ермаловіча «Па слядах аднаго міфа». У гутарцы прынялі ўдзел гісторык, археолаг, бард Пятро Русаў, дырэктар Дзяржынскай раённай бібліятэкі Валянціна Клімовіч, дырэктар школы Святлана Ганчар і загадчык школьнага краязнаўчага музея Вячаслаў Кавалеўскі. На прэзентацыі прагучала, што вуліца ў в. Малыя Навасёлкі, дзе нарадзіўся Мікола Ермаловіч і два яго вядомыя на Беларусі браты Леанід і Валянцін, носіць назву « Ленінская», і мясцовай грамадскасці даўно надышоў час узняць пытанне аб перайменаванні яе ў вуліцу братоў Ермаловічаў, а школе надаць імя Міколы Ермаловіча.

Праз два тыдні прэзентацыя кнігі адбылася і ў Дзяржынску, у Цэнтральнай раённай бібліятэкі. На сустрэчу з чытачамі горада і раёна прыехалі з Мінска галоўны рэдактар «Беларускага кнігазбору» ўкладальнік і аўтар каментарыяў кнігі, кандыдат гістарычных навук пісьменнік Кастусь Цвірка, паэт Міхась Скобла, гісторык, генеолаг, краязнаўца, журналіст Леанід Акаловіч, Анатоль Валахановіч і Пятро Русаў.

Усе гэтыя людзі добра ведалі Міколу Ермаловіча пры яго жыцці, і іхнія ўспаміны аб нашым выдатным суайчынніку ўспрымаліся з вялікай увагай. Міхась Скобла і іншыя выступоўцы адзначылі, што Мікола Ермаловіч, не меўшы ні вучоных ступеняў, ні званняў, амаль невідушчы, зрабіў відушчым свой беларускі народ. У сваіх кнігах «Па слядах аднаго міфа», «Старажытная Беларусь» ён ўпершыню грунтоўна даказаў, што ВКЛ было магутнай беларускай дзяржавай са сваім беларускім пісьменствам, з высокай культурай, гэта была дзяржава, якую паважалі і з якой лічыліся і ўсходнія і заходнія суседзі. Уся знаць Вялікага княства Літоўскага размаўляла ў той час тагачаснай беларускай літаратурнай мовай.



У чарзе да Кастуся Цвіркі, каб набыць кнігу з аўтографам



Сям'я Ермаловічаў

Мікола Ермаловіч, узнавіўшы праўду пра нашу старажытную дзяржаву, як бы праклаў шлях усім нам не толькі ў мінулае, але і ў будучыню. Бо толькі стоячы на грунце самастойнасці і самапавагі, мы зможам самазахавацца як нацыя і дзяржава. Анатоль Валахановіч адзначыў, што ў Маладзечна і Старых Дарогах ўстаноўлены помнікі Міколу Ермаловічу. На жаль, на яго малой радзіме нішто не нагадвае пра тое, што ён тут нарадзіўся і вырас.

Да ўвагі ўдзельнікаў прэзентацыі была прадстаўлена выстава з фондаў Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі «Яго чакала Беларусь чатыры стагоддзі». Яе матэрыялы прэзентавала галоўны бібліёграф бібліятэкі, паэтка Вольга Жыбурт.

Напрыканцы цікавай сустрэчы дырэктар бібліятэкі Валянціна Клімовіч падзякавала гасцям і шматлікім кнігалюбам, удзельнікам сустрэчы за цікава праведзенае культурнае мерапрыемства, прагучала прапанова аб наданні бібліятэцы імя выдатнага земляка, суайчынніка Міколы Ермаловіча. Жадаючыя змаглі набыць кнігу «Мікола Ермаловіч» з аўтографам Кастуся Цвіркі. Прадмову да кнігі напісаў выдатны гісторык Анатоль Грыцкевіч. Амаль палову кніга займае праца М. Ермаловіча «Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае», змешчаны таксама гутаркі і вершы, крытыка, публіцыстыка, лісты М. Ермаловіча, якія не друкаваліся раней.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ТОЙ САМЫ ФЭСТ

## ТЫДЗЕНЬ ДЛЯ АМАТАРАЎ ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАГА ТЭАТРА

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**З 21 па 26 красавіка ў Мінску праходзіць Першы міжнародны фестываль эксперыментальных тэатраў. Мэта фэсту пад назвай «Той самы фэст» — стварэнне ў Беларусі платформы для міжкультурнага дыялогу ў сферы сучаснага тэатра.**

Фестываль сабраў на мінскіх падмостках 18 тэатральных труп, больш за 120 удзельнікаў і спецыяльных гасцей з 9 краін свету.

Галоўная атракцыя — вулічныя і пластычныя спектаклі эксперыментальных калектываў з Германіі, ЗША, Чэхіі, Славакіі, Славеніі, Польшчы, Расіі і Беларусі, а таксама праца юнацкіх тэатраў Моладзевай праграмы фэсту. У межах праграмы адбываюцца і дабрачынныя акцыі: паказ дзіцячай анімацыі «Мы ёсць!» (навукова-практычны цэнтр п. Бараўляны) і спектакль лялечнай студыі «Ціхі Акіян» (дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў).

— «Той самы фэст» актуальны для сучаснай беларускай культуры, бо ён робіцца рукамі маладых, — гаворыць тэатральны крытык Аляксей Стрэльнікаў. — Гэта цалкам — ад канцэпцыі ўсяго мерапрыемства да рэжысуры асобных спектакляў — ініцыятыва беларускай моладзі, творцаў у веку да 30 гадоў (ці крышачку старэйшых). Наведаўшы імпрэзы фестывалю, можна пабачыць, якія густы і памкненні ў новай генерацыі творчых людзей у нашай краіне».

«Той самы фэст» арганізаваны тэатрам-студыяй ім Е. Міровіча і тэатрам-студыяй «Ронда», а ў якасці суарганізатараў выступаюць Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Цэнтр беларускай драматургіі і рэжысуры, канцэртна-прадзюсарскае агенцтва «БОпромо» і Муніцыпальная ўстанова па культуры горада Бона (Германія).

Апроч паказу конкурсных спектакляў для ўдзельнікаў і гасцей фэсту — бясплатныя майстар-класы. Падрабязную праграму фестывалю і майстар-класаў можна пабачыць на http://rondstudio.org.

Да падзеяў фестывалю яшчэ не позна далучыцца.

### Спектаклі другой паловы фэсту

**23 красавіка, субота**

16.00 — «ЭСКОREAL» — пластычны спектакль тэатра «EYE» (Беларусь) у Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі.

17.00 — «Наташина Мара» — драма Валакаламскага народнага тэатра (Расія) у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, малая сцэна.

18.00 — Паказ фільмаў дзіцячага Цэнтра тэатра і кіно ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, малая сцэна.

19.00 — «Monster / Girl» — спектакль-Бута тэатра «Lucid Street Theatre» (ЗША) у Новым драматычным тэатры.

20.00 — «Кропка Зборкі» — пластычны спектакль тэатра «Бармаглот» (Беларусь) у Новым драматычным тэатры.

**24 красавіка, нядзеля**

18.00 — «Войцек» — драма тэатра «Марабу» (Германія) у Новым драматычным тэатры.

20.00 — «Красавіцкія вядзьмарствы», драматычны спектакль тэатра «Д.Е.М.И.» (Расія). Маладзёжная праграма ў Новым драматычным тэатры.

**25 красавіка, панядзелак**

17.00 — «Уварванне» — вулічны спектакль тэатра «Kud Ljud» (Славенія) у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

18.00 — «Маналог» — пластычны спектакль тэатра «Debris company» (Славакія) у Маладзёжным тэатры эстрады.

18.40 — Перфоманс фестывалю «Навінкі» ў фае Маладзёжнага тэатра эстрады.

19.00 — Вечар сучаснай харэаграфіі — тэатр «Каракули» (Беларусь) у Маладзёжным тэатры эстрады.

**26 красавіка, аўторак**

15.00 — «Часам ідзе дождж» — пластычны спектакль тэатра-студыі «Рондо» (Беларусь) у Тэатры беларускай драматургіі.

17.00 — «10 хвілін надзеі» — драма тэатра-студыі «Класс-А» (Беларусь) — моладзевая праграма ў гімназіі №74.

19.00 — «Не Танцы» — пластычны спектакль «Корняг-театра» (Беларусь) у Палацы прафсаюзаў.

**Кошт квіткоў:** 10 000, 15 000, 20 000

**Квіткі можна замовіць па тэлефонах:** +375-29-334-52-45, +375-29-514-25-25; купіць у касе тэатра, у якім будзе праходзіць жаданы спектакль, або забраніраваць на сайце www.kvitki.by

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 429

Падпісана да друку 22.04.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.